З ПАВАГАЙ ДА БАГАЦЦЯЎ ЗЯМЛІ 4

У ВІРЫ ТВОРЧАСЦІ 13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

13 ВЕРАСНЯ 2022 г. АЎТОРАК № 179 (29801)


## ЦЫТАТА ДНЯ

**Аляксандр ЧАРВЯКОЎ, міністр эканомікі:**

*«Мы за тое, каб бізнес развіваўся і рос. Каб была магчымасць пераходзіць з адной катэгорыі ў больш дасканалую, арганізаваную. У гэтым задача дзяржавы — ствараць больш прадпрыемстваў. Сярод гэтых стымулаў прапануецца «бясшвовы» пераход з індывідуальных прадпрымальнікаў у юрыдычныя асобы. Калі індывідуальны прадпрымальнік захоча стаць юрыдычнай асобай, то такая працэдура цяпер займае каля года. Мы прапанавалі сістэму, па якой можна перарэгістравацца дзень у дзень. Пры гэтым усе абавязацельствы перад крэдыторамі, банкамі, іншымі фізічнымі або юрыдычнымі асобамі пераафармляюцца. Значна спрошчана сістэма пераафармлення ліцэнзій, рашэнняў».*

Напярэдадні

# ШЛЯХАМІ ПАМЯЦІ

Фота БелТА.

**Учора ў Полацку стартавала Рэспубліканская акцыя «Сімвал адзінства», прымеркаваная да Дня народнага адзінства. Яе арганізатарамі выступілі Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне «Патрыёты Беларусі» і Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі. Усяго ўдзельнікі акцыі на аўтамабілях наведаюць 118 райцэнтраў краіны і праедуць звыш сямі тысяч кіламетраў.**

СТАР. 3

## КАРОТКА

- **Дазволена наведванне лясоў Віцебскай, Мінскай, Магілёўскай і Гродзенскай абласцей.**
- Больш за 230 тысяч іншаземцаў наведалі Беларусь па бязвізе.
- **Мінскі дынамавец Раян Спунер прызнаны найлепшым форвардам другога тыдня чэмпіянату КХЛ.**
- Маладыя оперныя салісты выканаюць сусветныя шэдэўры ў Белдзяржфілармоніі 16 верасня.
- **У Віцебскім раёне падчас уборкі бульбы трактарыст знайшоў арсенал часоў ВАВ.**
- Экалагічны маніторынг у Гродзенскай вобласці выявіў больш за 800 га з залатарнікам канадскім.

Векапомнае

# ЗАБЫТЫЯ ГЕРОІ

**У гады Вялікай Айчыннай вайны падпольшчык Васіль Клімук зрабіў мінскую інфекцыёнку адным з цэнтраў антыфашысцкай барацьбы**

**Гарадская клінічная інфекцыйная бальніца сталіцы з'яўляецца адной з найстарэйшых установаў аховы здароўя краіны. Сваіх першых пацыентаў яна прыняла ў лістападзе 1913 года. Дагэтуль на тэрыторыі бальніцы функцыянуюць карпусы, пабудаваныя больш як сто гадоў таму. Супрацоўнікі медыцынскай установы ганарацца сваёй гісторыяй. Асабліва ваенным перыядам — у гады нямецка-фашысцкай акупацыі на базе інфекцыйнай бальніцы дзейнічала падпольная група пад кіраўніцтвам Васіля Клімука.**

СТАР. 5

Рабі дабро

# КАЛІ ЎЗРОСТ НЕ ПЕРАШКОДА

**Як стаць валанцёрам «сярэбранага» ўзросту і чым можна дапамагчы?**

**Выходзячы на пенсію, пажылы чалавек нярэдка страчвае сваю сацыяльную ролю ў грамадстве. Яшчэ ўчора былі праца і зацікаўленасць у вашых ведах і вопыце, калектыў і шмат кантактаванняў штодзень, а вось з выхадам на заслужаны адпачынак жыццё рэзка мяняецца. Адна з магчымасцяў заставацца запатрабаваным у любым узросце — валанцёрства. Гэта і кантактаванне, і пачуццё каманднага духу, а таксама новыя веды, навыкі і ўражанні. Стаць валанцёрам проста, прычым зрабіць гэта можна ў любым пункце краіны — дастаткова звярнуцца ў тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва ці, напрыклад, рэгіянальнае прадстаўніцтва Беларускага Чырвонага Крыжа. Чаму навучаюць валанцёраў? Якую дапамогу яны могуць аказваць? І што ад гэтага атрымлівае сам валанцёр? Навошта закон аб валанцёрстве і якія гарантыі ён будзе ўтрымліваць? Пра гэта расказалі спецыялісты.**

СТАР. 12

ISSN 1990 — 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СА «ЗВЯЗДОЙ» ЦЯПЛЕЙ І ЎТУЛЬНЕЙ!

Ідзе падпіска на IV квартал 2022 года.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ ВОСЕННЮ І ЗІМОЙ. БУДЗЕ ЦІКАВА!

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Каб прыбыткова прадаць прадукцыю на экспарт, патрабуецца віртуозная лагістыка»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў нараду, прысвечаную рабоце транспартнага комплексу краіны ва ўмовах санкцый. Гэтае пытанне кіраўнік дзяржавы ўзнімаў у пачатку жніўня, падчас пасяджэння Савета Міністраў, на якім абмяркоўвалася функцыянаванне эканомікі ва ўмовах санкцый і меры па іх пераадоленні. Праз месяц на нарадзе спецыялісты падрабязна абмеркавалі сітуацыю ў гэтай сферы.**

«Не сакрэт, што менавіта транспартная галіна, з'яўляючыся натуральным правадніком знешнегандлёвых аперацый, прыносіць у краіну амаль палову валавой выручкі (40—45 %) ад экспарту паслуг», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Ён заўважыў, што сітуацыя, якая цяпер склалася, разарвала многія даўно выбудаваныя лагістычныя ланцужкі. Зразумела, гэта прыводзіць да выдаткаў вытворцаў ва ўсіх галінах. Па словах Прэзідэнта, сёння, каб прыбыткова прадаць сваю прадукцыю на экспарт або паставіць на ўнутраны рынак камплектуючыя, патрабуецца сапраўды віртуозная лагістыка.

«І прасцей, ва ўсякім разе ў найбліжэйшай будучыні, не стане, — заўважыў кіраўнік дзяржавы. — Таму па-ранейшаму штодзённая работа Мінтранса — дамаўляцца аб вагонах, кантэйнерах, прапускных «вокнах», канкурэнтных тарыфах. Тым больш што задачы па нарошчванні фізічных аб'ёмаў і дыверсіфікацыі экспарту галіновым міністрам пастаўлены. Іх выкананне ў некаторым родзе залежыць і ад паваротлівасці Мінтранса».

Асобна Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на авіяперавозкі. Па яго словах, нягледзячы на жаданне Захаду адрэзаць нас ад так званай цывілізаванай Еўропы, мы працягваем лятаць і захоўваем высокі ўзровень авіяцыйнай бяспекі.

Па словах Прэзідэнта, стратэгічная задача — пашырыць напрамкі авіязносін, даць людзям магчымасць лятаць па пытаннях бізнесу, на адпачынак, наведваць родных. «Пры гэтым важна захаваць высокі ўзровень бяспекі палётаў, не спыняцца ў развіцці авіяцыйнай галіны, прадоўжыць абнаўленне авіяпарка, — удакладніў кіраўнік дзяржавы. — Але кошт пералётаў павінен быць канкурэнтны і не залімітавы для нашых людзей, чаго б гэта ні каштавала».

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што з пачатку ўвядзення абмежаванняў прайшло дастаткова часу, каб не толькі знайсці ўсе праблемныя месцы, але і прыняць адэкватныя меры рэагавання. «Так, мы своечасова адлюстравалі, што называецца, забарону на перамяшчэнне грузавых аўтамабіляў з Еўрасаюза па нашай тэрыторыі, — нагадаў беларускі лідар. — Цяпер штодня на перачэпцы ў нас каля тысячы транспартных сродкаў. Сюды прыехалі — будзьце ласкавыя пакінуць свой груз, прычэпы, едзьце назад — мы павязём далей ваш груз».

Кіраўнік дзяржавы папрасіў далажыць, як Мінтранс вырашае задачы па нарошчванні перавозак чыгункай перш за ўсё ва ўсходнім напрамку. Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ніхто не абмяжоўвае перавозкі па ўсіх напрамках. У любым выпадку, забяспечанасць кантэйнерамі пад патрэбу павінна быць стапрацэнтная — такую задачу перад транспартнай галіной паставіў беларускі лідар.

Таксама Прэзідэнт пацікавіўся, ці выбудавана аптымальная для цяперашніх умоў лагістыка. «Расія дае нам адпаведныя магчымасці. Аб гэтым ужо шмат казалі, у прыватнасці аб партах», — удакладніў кіраўнік дзяржавы і спытаў, як выконваюцца інтарэсы беларускіх аўтамабільных перавозчыкаў (даручэнне па адмене дазвольнай сістэмы было дадзена Прэзідэнтам яшчэ два гады таму). Якія меры прымаюцца па ўмацаванні эканамічнага становішча авіяцыйнай галіны — яшчэ адно з пытанняў, якое абмяркоўвалася падчас нарады.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Валерыя СЦЯЦКО.**

## Каментарый у тэму

Як адзначыў падчас размовы з журналістамі **намеснік прэм'ер-міністра Анатоль СІВАК,** фактары, якія ўскладняюць работу транспартнай галіны, з'явіліся яшчэ з пачаткам пандэміі ў 2020 годзе, і гэта расцягнулася дастаткова на працяглы перыяд. «Вельмі важна было ў гэты момант (у першую чаргу патрабаванне кіраўніка дзяржавы) захаваць калектывы транспартных прадпрыемстваў», — расказаў віцэ-прэм'ер. Па яго словах, такіх спецыялістаў, як пілоты, бортправаднікі або праваднікі ў вагонах, нельга набраць на біржы працы, гэта вельмі сур'ёзныя кадры, якія адказваюць за жыццё чалавека.

Анатоль Сівак заўважыў, што рост, які сёння назіраецца ў транспартным комплексе, звязаны з тым, што як толькі пайшло паслабленне (маюцца на ўвазе абмежаванні, звязаныя з пандэміяй. — **«Зв.»**), галіна пачала актыўна працаваць. «Што датычыцца грузавых перавозак, тут таксама вельмі важны момант, які заключаецца ў тым, што ўся санкцыйная палітыка, якую мы назіраем пэўны перыяд часу, патрабуе ад нас пераарыентацыі транспартных патокаў, — акцэнтаваў увагу віцэ-прэм'ер. — Павінна быць узгодненая пазіцыя грузаадпраўніка і перавозчыка. У гэтай сітуацыі задача нумар адзін — нарошчваць аб'ёмы перавозак. Грузавая база ў нас у краіне ёсць. Эканоміка працуе. Патрабаванні нашых партнёраў да нашай эканомікі, тавараў, якія ў нас вырабляюцца, вялікія. Тое, што неабходна будзе перавезці, перавязём».

Гаворачы аб аўтатранспарце, Анатоль Сівак расказаў аб рабоце па рэалізацыі падпісаных саюзных праграм з Расіяй. «У рамках іх рэалізацыі рыхтуецца пэўная пагадненні, якія ў гэтым годзе павінны быць падпісаны, — паведаміў ён. — І там рэфрэнам з'яўляюцца роўныя ўмовы гаспадарання для суб'ектаў, у гэтым выпадку ў транспартнай дзейнасці».

Што датычыцца перавозкі калійных угнаенняў, то, па словах намесніка прэм'ер-міністра, аб'ёмы перавозак толькі растуць. Праблему транспарціроўкі поўнасцю задавальняе Беларуская чыгунка. Пры гэтым выкарыстоўваецца партовая інфраструктура Расійскай Федэрацыі. Нягледзячы на тое, што частка рухомага саставу (мінералавозы) для транспарціроўкі па чыгунцы калійных угнаенняў засталася ва Украіне, Магілёўскі вагонабудаўнічы завод актыўна працуе, каб аднавіць гэты рухомы састаў.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Антыгуа і Барбуда плануе правесці рэферэндум аб выхадзе з-пад улады брытанскай манархіі

Па словах прэм'ера Антыгуа і Барбуды Гастана Браўна, прапрацоўваецца пытанне аб правядзенні рэферэндуму ў найбліжэйшыя тры гады. На галасаванне будзе ўзнята пытанне аб выхадзе краіны з-пад улады брытанскай манархіі і станаўленні рэспублікай. Пра гэта паведаміла РІА «Навіны». Антыгуа і Барбуда ўваходзіць у Брытанскую садружнасць нацый. Аб'яднанне з'яўляецца добраахвотным і ўключае, апроч Вялікабрытаніі, амаль усе яе былыя калоніі, дамініёны і пратэктараты. Гастан Браўн удакладніў, што такое рашэнне не з'яўляецца праявай рознагалоссяў паміж Антыгуа і Барбудай і манархіяй, але дапаможа стаць насамрэч суверэннай краінай.

### Прэзідэнт Германіі папярэдзіў аб росце колькасці бяздомных

У Германіі можа ўзрасці колькасць бяздомных грамадзян з-за росту цэн, заявіў прэзідэнт ФРГ Франк-Вальтэр Штайнмаер. «Войны і крызісы могуць прывесці да таго, што яшчэ больш людзей у нашай краіне будуць адчуваць недахоп жылля восенню і зімой. Бедныя людзі, асабліва сем'і, якія з прычыны росту цэн больш не змогуць плаціць за арэнду або дадатковыя выдаткі, рызыкуюць страціць сваё жыллё. А людзям, якія шукаюць кватэру, можа быць яшчэ цяжэй знайсці даступнае месца для пражывання», — адзначаецца ў прамове прэзідэнта Германіі, апублікаванай на яго сайце. Паводле афіцыйных звестак, больш за 300 тысяч чалавек у гэтай краіне не маюць уласнага жылля, а 45 тысяч з іх начуюць на вуліцы.

### У Парыжы «жоўтыя камізэлькі» ўчынілі масавыя беспарадкі

Больш за 100 чалавек затрымала паліцыя Парыжа падчас беспарадкаў, якія ўчынілі прыхільнікі руху «жоўтыя камізэлькі». Яны выступілі супраць палітыкі прэзідэнта Францыі Эмануэля Макрона, якая выклікала імклівы рост цэн, у тым ліку на электраэнергію, паведаміў партал «MIP24». Мітынг насіў агрэсіўны характар: ідучы па вуліцах, людзі грамілі лаўкі і палілі смеццевыя бакі. Пратэстоўцы выказалі незадаволенасць палітыкай Макрона, якая, на іх думку, прывяла да росту інфляцыі і імклівага павелічэння цэн. Удзельнікі акцыі падкрэслілі, што такая сітуацыя склалася не толькі ў Францыі, але і ва ўсёй Еўропе. Кошт электраэнергіі ў краіне нядаўна пабіў гістарычны рэкорд, склаўшы тысячу еўра за мегават-гадзіну. Гэта на 1000 працэнтаў больш, чым год таму, як напісала газета Le Figaro. Для эканоміі электраэнергіі прапанавалі нават зменшыць падсвятленне Эйфелевай вежы.

**Мітрапаліт ВЕНІЯМІН:**

# «Мы часта назіраем стаўленне да шлюбу як да нечага састарэлага, неабавязковага»

## У Мінску пройдзе Міжнародны форум славянскіх сем'яў

**Міжнародны форум славянскіх сем'яў пройдзе ў Мінску 23 верасня.**
**Яго мэта — садзейнічаць захаванню традыцыйных духоўна-маральных каштоўнасцяў, арыентаваных на моцную сям'ю, нараджэнне дзяцей, пераемнасць пакаленняў.**
**У мерапрыемстве возьмуць удзел прадстаўнікі Рускай і Беларускай праваслаўнай царквы, Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, Міністэрства адукацыі, Міністэрства аховы здароўя і Міністэрства інфармацыі. Таксама сярод запрошаных будзе і мэтавая аўдыторыя — моладзь з ліку студэнтаў і навучэнцаў, маладых спецыялістаў.**

Як адзначыў **Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веніямін, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі,** у сучасных умовах правядзенне падобнага форуму набывае асаблівую значнасць.

— Агульнапрызнана, што мы жывём у няпросты час — эпоху эканамічных, сацыяльных, палітычных, духоўных крызісаў. І адзін з самых вострых — крызіс сям'і. І ў яго шмат прычын самага рознага характару. Але, аналізуючы іх, немагчыма не прызнаць, што найважнейшай з'яўляецца менавіта скажэнне каштоўнасных арыенціраў, прынятых у грамадстве, — адзначыў Уладыка. — Напрыклад, матэрыяльнае становішча, несумненна, можа паўплываць на рашэнне маладой сям'і адмовіцца на доўгі час ад нараджэння дзіцяці. А з іншага боку, мы бачым, што менавіта краіны з высокім дабрабытам часта сутыкаюцца з дэмаграфічным крызісам.

Мітрапаліт канстатаваў, што ў сучасным свеце мы часта назіраем стаўленне да шлюбу як да нечага састарэлага, неабавязковага. Маладыя людзі часта прытрымліваюцца лжывага ўяўлення аб тым, што сям'я можа перашкодзіць рэалізацыі чалавека як асобы, прафесіянала і члена грамадства. Таму многія адкладваюць яе стварэнне да пэўнага часу, калі гэта зрабіць бывае значна складаней.

— Нядаўнія даследаванні паказваюць, што людзі па ўсім свеце пачынаюць усведамляць, што падобныя адносіны да сям'і прыводзяць да глыбокага крызісу, прычым не толькі ў духоўна-маральнай сферы. Відавочна, што грамадства, дзе эгаістычныя каштоўнасці пераважаюць над сямейнымі, а дзеці ўспрымаюцца як абуза, непазбежна сутыкнецца з цяжкімі сацыяльна-эканамічнымі праблемамі, — адзначыў Мітрапаліт.

Яшчэ адным довадам супраць уступлення ў шлюб з'яўляецца ўяўленне аб тым, што сямейнае жыццё накладае няпростыя абавязацельствы. Аднак такі погляд — відавочная прыкмета таго, што чалавек не пасталеў.

— Дарослы чалавек пастаянна прымае на сябе абавязацельствы, нясе адказнасць не толькі за сябе, але і за іншых. І сям'я тут не выключэнне. Пры правільна пабудаваных сямейных адносінах сям'я становіцца крыніцай натхнення, падштурхоўвае чалавека да здзяйсненняў на творчым, прафесійным і іншым полі дзейнасці. Мне неаднойчы прыходзілася сутыкацца з такой сітуацыяй, калі людзі, якія сапраўды дасягнулі па чалавечых мерках многага ў грамадстве, сведчылі, што гэта дзякуючы таму, што маюць добрую сямейную абстаноўку і, вяртаючыся з работы пасля цяжкай працы і перажыванняў, могуць дома адпачыць, аднавіць сілы і настроіцца на іншы лад, — дадаў Мітрапаліт. — У сям'і важна бачыць не проста сацыяльны інстытут і тым больш не фактар, які абмяжоўвае свабоду, а рэальнасць, якая дорыць чалавеку радасць, гармонію і паўнату жыцця.

**Намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Валерый КАВАЛЬКОЎ** падкрэсліў, што сям'я заўсёды знаходзіцца ў цэнтры ўвагі дзяржавы. Гэта, у прыватнасці, дапамога ў вырашэнні жыллёвага пытання — сёння сем'і з трыма дзецьмі амаль бясплатна яго вырашаюць.

Маладыя людзі нярэдка імкнуцца адкласці нараджэнне дзяцей, бо на першае месца выходзіць кар'ера. Таму ў Працоўны кодэкс сёння ўнесены такія паняцці, як няпоўны працоўны дзень, дыстанцыйная работа. Маці з малым да трох гадоў можа працаваць і адначасова атрымліваць дапамогу. Нядаўна ўведзены і бацькоўскі адпачынак, які наймальнік дае на два тыдні пры нараджэнні дзіця.

Валерый Кавалькоў адзначыў што нярэдка да нас пранікаюць чужыя «каштоўнасці» — быццам бы сям'і не патрэбна дзіця. Будучы форум паспрабуе змяніць такія стэрэатыпы. Падчас яго пройдуць круглыя сталы, дзе спецыялісты раскажуць пра аспекты развіцця сямейных адносін і нагадаюць пра традыцыйныя для нашай культуры каштоўнасці.

**Алена КРАВЕЦ.**

Моцныя рэгіёнамі

# ПОШУК НОВЫХ РЫНКАЎ, ІНВЕСТПРАЕКТЫ, АРЭНДНАЕ ЖЫЛЛЁ

**Як развіваецца Капыльскі раён, «Звяздзе» расказаў старшыня райвыканкама Сяргей ПЛІШЧЫК**

***— Сяргей Міхайлавіч, ці ўдаецца прадпрыемствам Капыльшчыны своечасова рэагаваць на змяненне сітуацыі на рынках збыту?***

— Так. Капыльскі лясгас пачынае пастаўляць прадукцыю ў Кітайскую Народную Рэспубліку, Азербайджан, Узбекістан і іншыя краіны. У раёне ўсе прадпрыемствы працуюць стабільна, без прастояў. Працягваецца рэалізацыя двух значных інвестыцыйных праектаў: Агракамбіната «Дзяржынскі» па выпуску 6000 тон мяса індычкі штогод у аграгарадку Пясочнае, а таксама будаўніцтва цэха па вытворчасці малака з капілярна-порыстай структурай на Капыльскім філіяле Слуцкага сыраробнага камбіната. Гэты праект мае высокую навукаёмістасць і арыентаваны на экспарт у краіны блізкага і далёкага замежжа.

***— Колькі гэта дазволіць стварыць новых працоўных месцаў?***

— На дзве новыя вытворчасці, якія будуць адкрытыя ў 2023 годзе, плануецца працаўладкаваць каля 500 чалавек. Гэта будуць месцы з высокім узроўнем зарплаты. Акрамя таго, у раёне кожны год з'яўляецца каля 12 малых прадпрыемстваў, якія забяспечваюць працаўладкаванне каля 30 чалавек. За сем месяцаў гэтага года зарэгістравана 10 прадпрыемстваў і сфарміравана 17 новых рабочых месцаў.

На базе Капыльскага дзяржаўнага каледжа эфектыўна працуе цэнтр па падтрымцы прадпрымальніцтва, рэалізоўваюцца стартап-праекты. Таксама дзейнічае бізнес-кампанія «Эргана», што аб'ядноўвае пачынаючых індывідуальных прадпрымальнікаў, навучэнскую моладзь, якія шукаюць новыя ідэі і адкрываюць свой бізнес.

***— Сяргей Міхайлавіч, на што ў раёне робіцца акцэнт у сельскай гаспадарцы?***

— У першую чаргу ўдзяляем увагу рэнтабельнасці. Для гэтага ўмацоўваем матэрыяльную базу раслінаводства і жывёлагадоўлі, павялічваем аб'ёмы вытворчасці малака, мяса, зерня і іншай прадукцыі. У планах — будаўніцтва малочнатаварных комплексаў, працуем над павелічэннем прадукцыйнасці дойнага статку. У раслінаводстве ставім на першае месца забеспячэнне галіны травяністымі кармамі і зернефуражом. Працягваецца работа па адпрацоўцы спецыялізацыі ў раслінаводстве, карэктуецца структура пасяўных плошчаў.

***— Як справы з кадрамі?***

— У асноўным раён забяспечаны кваліфікаванымі кадрамі. Аднак у сельгаспрадпрыемствах ёсць запатрабаванасць у ветэрынарных урачах (сем вакансій), заатэхніках (чатыры вакансіі), аграномах (дзве вакансіі).

Сістэма аховы здароўя недастаткова ўкамплектавана медыкамі. Ёсць неабходнасць у стаматалогах-тэрапеўтах, стаматалогах-хірургах, урачах-хірургах, урачах агульнай практыкі, таксама патрабуецца ўрач-кардыёлаг, урач-рэнтгенолаг.

Сістэма адукацыі забяспечана педагагічнымі кадрамі на 99 працэнтаў. Недахоп у настаўніках фізікі, матэматыкі, замежных моў, пачатковых класаў, псіхолагах, сацыяльных педагогах, лагапедах ліквідуецца за кошт прыцягнення педагогаў пенсіённага ўзросту і сумяшчальнікаў.

Сёлета ў раён прыехала 108 маладых спецыялістаў, у тым ліку 44 з вышэйшай адукацыяй, 38 з сярэдняй спецыяльнай і 26 з прафесійна-тэхнічнай. У сельгасарганізацыях маладыя спецыялісты забяспечваюцца інтэрнатам, кватэрай або індывідуальным домам. У іншых сферах, як правіла, іх селяць у інтэрнаты, а пытанні забеспячэння ўласным жыллём разглядаюцца ў адпаведнасці з раённай праграмай жыллёвага будаўніцтва.

У раёне пастаянна ўдасканальваюцца формы работы па адаптацыі моладзі ў працоўных калектывах, праводзяцца круглыя сталы, сустрэчы з кіраўніцтвам раёна, арганізацый і прадпрыемстваў, актывістамі грамадскага аб'яднання «Белая Русь», прадстаўнікамі прафсаюза, дні адчыненых дзвярэй, кансультацыі юрыстаў, псіхолагаў, злёты маладых спецыялістаў.

***— Як наогул вырашаецца кватэрнае пытанне?***

— Цяпер у райцэнтры ўзводзіцца 18-кватэрны жылы дом. Долевы ўдзел у яго будаўніцтве прымаюць пяць арганізацый. У далейшым пабудаваныя кватэры пяройдуць у разрад арэнднага жылля і будуць выдзелены работнікам гэтых арганізацый.

Фінансаванне будаўніцтва сацыяльнага жылля вядзецца за кошт бюджэтных сродкаў. На 2022 год яны не выдзелены, таму пакуль такое жыллё ў горадзе не ўзводзіцца.

Сёння грамадзяне імкнуцца самастойна выступаць заказчыкамі будаўніцтва індывідуальных жылых дамоў. Для гэтага ў раёне дастаткова зямельных участкаў, забяспечаных мінімальнай інфраструктурай. Тым, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, аказваецца дзяржаўная падтрымка.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

Надвор'е

# Невялікія дажджы і туманы, стане крыху цяплей, але...

## Ужо не лета

**Па словах сіноптыкаў, на гэтым тыдні вільготныя франтальныя раздзелы зноў не абмінуць нашу краіну. Чакаюцца кароткачасовыя дажджы. За кошт больш шчыльнай воблачнасці ночы стануць цяплейшымі — ад плюс 5 да плюс 13 градусаў. Аднак воблачнасць будзе перашкаджаць дзённаму прагрэву, таму дзённыя максімумы ў асноўным не перавысяць плюс 13—20 градусаў, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У аўторак будзе воблачна з праясненнямі. У гэты дзень ападкаў не чакаецца, але ў ранішнія гадзіны ў асобных раёнах будзе назірацца туман. Вецер пераменных напрамкаў 2—7 м/с. Максімальная тэмпература паветра складзе 13—18 градусаў цяпла.

Адносна цяплей будзе ўжо ў сераду. У сярэдзіне тыдня ўначы месцамі, а раніцай і днём на большай частцы тэрыторыі краіны чакаюцца кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай у асобных раёнах слабы туман. Удзень месцамі магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад плюс 5 градусаў да плюс 12 градусаў, а днём ад плюс 13 градусаў па паўночным усходзе да 22 цяпла па паўднёвым захадзе.

Прыкладна такое ж надвор'е захаваецца і ў чацвер. У гэты дзень месцамі па краіне прагназуюцца кароткачасовыя дажджы. Днём у асобных раёнах магчымы навальніцы. Уначы тэмпература паветра складзе плюс 8—13 градусаў. Удзень паветра прагрэецца да плюс 15—21 градусаў.

Дастаткова дажджліва будзе ў Беларусі і ў пятніцу. Чакаецца, што 16 верасня ноччу месцамі, а днём на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай у асобных раёнах туман. Тэмпература паветра ноччу плюс 7—13 градусаў, а ўдзень — плюс 12—19 градусаў.

Згодна з папярэднім прагнозам айчынных сіноптыкаў, няўстойлівы характар надвор'я захаваецца ў Беларусі і ў выхадныя дні. У гэтыя два дні ноччу месцамі, раніцай і днём на большай частцы тэрыторыі краіны сіноптыкі зноў абяцаюць кароткачасовыя дажджы. Уначы ў асобных раёнах слабы туман. Ноччу слупок тэрмометра пакажа плюс 5—11 градусаў, а ўдзень — плюс 10—17 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ШЛЯХАМІ ПАМЯЦІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Адпраўным пунктам акцыі старажытны Полацк быў абраны невыпадкова: менавіта на гэтай тэрыторыі зараджалася наша дзяржаўнасць. Старт аўтапрабегу на «Кургане Бессмяротнасці», дзе сабрана зямля з усіх брацкіх магіл Беларусі, даў полацкі заслужаны тэатр «Пілігрым» спектаклем на ваенную тэматыку. Падчас дзеяння ўдзельнікаў мерапрыемства знаёмілі з гісторыяй вызвалення горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў — толькі 4 ліпеня 1944 года Полаччына стала свабоднай, больш чым 20 гадоў спатрэбілася, каб узняць горад з руін. Адсюль удзельнікі акцыі ўзялі першую дэталь сімвалічнага гадзінніка памяці, які складуць у адно цэлае на апошняй станцыі мерапрыемства.

«Дэталі гадзінніка абраны злучальным звяном невыпадкова — гэта сімвал таго, што ўсе вобласці і мы, беларусы, — частка адзінага механізму і існаваць асобна не можам», — падкрэсліла **старшыня Віцебскай абласной арганізацыі РГА «Патрыёты Беларусі» Вольга МАЦЮСЬ.**

На ўсім шляху — звыш сямі тысяч кіламетраў — патрыёты будуць устанаўліваць банеры, прымеркаваныя да Года гістарычнай памяці, і шыльды з QR-кодамі на брацкіх пахаваннях і месцах спаленых вёсак. З дапамогай смартфона любы ахвотны зможа не толькі азнаёміцца з гісторыяй воінскага мемарыяла, але і паслухаць успаміны жывых сведак страшных ваенных ліхалецяў — удзельнікаў Вялікай Айчыннай. Яшчэ арганізатары плануюць збіраць грамадзянскія ініцыятывы і прапановы дзеля паляпшэння ўзроўню жыцця населеных пунктаў. Па словах намесніка старшыні РГА «Патрыёты Беларусі» Ганны Харуты, не менш важнай задачай падчас работы з насельніцтвам з'яўляецца зладжаная работа паміж грамадскімі аб'яднаннямі. Маладзёжныя ініцыятывы перададуць БРСМ, пытанні сям'і — Беларускаму саюзу жанчын. Гэта яшчэ адзін паказчык адзінства, нават у межах такога ўзаемадзеяння.

У райцэнтрах, якія будуць прымаць эстафету акцыі, пройдуць святочныя канцэрты з удзелам беларускіх артыстаў пры падтрымцы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Будуць запрошаны ветэраны вайны і працы, актывісты грамадскіх арганізацый і працаўнікі.

Учора калона, у складзе якой 42 аўтамабілі, наведала Полацк, Наваполацк, Браслаў, Верхнядзвінск, Расоны, Мёры. Сёння рэспубліканская акцыя робіць патрыятычныя прыпынкі ў Шаркаўшчыне, Паставах, Глыбокім, Докшыцах, Лепелі. Пазней да ўдзельнікаў «Сімвала адзінства» далучацца жыхары Гродзенскай, Брэсцкай, Гомельскай, Магілёўскай і Мінскай абласцей. Фінал акцыі пройдзе 10-11 снежня ў Мінску.

Надыходзячы Дзень народнага адзінства будзе адзначацца ў нашай краіне другі раз. Ідэя яго ўстанаўлення прагучала ў лютым мінулага года на VI Усебеларускім народным сходзе. Прэзідэнт падтрымаў ініцыятыву і падпісаў 7 чэрвеня 2021 года ўказ аб заснаванні новага дзяржаўнага свята. Сёлета, у Год гістарычнай памяці, яно абяцае быць яшчэ больш маштабным і насычаным.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**
**Фота БелТА.**

# ЧОРНАЕ БАГАЦЦЕ СІНЯВОКАЙ

## Тарфяныя брыкеты, сушонка, грунты і... касметыка

**Беларусь займае трэцяе ў свеце месца па аб'ёмах здабычы торфу, запасы якога ў краіне ацэньваюцца ў больш як чатыры мільёны тон. Сёлета плануецца нарыхтаваць да 2,5 мільёна тон. Як здабываецца торф і што з яго вырабляюць, расказалі і паказалі эксперты энергетычнай сферы.**

### ВУЗКАКАЛЕЙКА І БУЯКІ

Сезон у торфаздабычнікаў пачынаецца ў маі. Каб распачаць яго, патрэбна тры-чатыры дні без дажджоў. Сёлетні сезон быў няпросты: месяц амаль нічога не здабывалі з-за празмерных дажджоў, аднак дзякуючы пнеўматычнаму спосабу (з дапамогай спецыяльнай машыны, якая нагадвае вялізны прамысловы пыласос) двухдзённы цыкл для нарыхтоўкі торфу скарацілі да аднадзённага. Праз змяненне клімату канец сезона прыпадае ўжо і на верасень, аднак чым хутчэй нарыхтуеш прадукт, тым раней пяройдзеш да рамонтных работ на палях, калі яшчэ не пачаліся дажджы, расказаў **Віталь НЕСПЛЯК, дырэктар філіяла «Віцебскторф» прадпрыемства «Віцебскаблгаз»**:

**На рэкультываваных пасля здабычы торфу палях спецыялісты вырошчваюць буякі. Такі вопыт распачаты сумесна з вучонымі Акадэміі навук і Батанічнага саду.**

*— Віцебскае тарфяное прадпрыемства працуе з 1956 года, калі тут здабывалі толькі кавалкавы торф. У 70-х гадах мінулага стагоддзя збудавалі брыкетны завод магутнасцю 100 тысяч тон, хаця здабывалі каля 600 тысяч тон, якія ўжываліся для сельскай гаспадаркі і электра- і цеплазабеспячэння. У 2000-х прадпрыемства стала эканамічна немэтазгодным і ў 2007-м было далучана да «Віцебскаблгаза». Тады экспартавалася прадукцыі на 400 тысяч долараў, а летась паставілі ўжо больш як на 4,5 мільёна. Асноўныя краіны для экспарту зараз — Расія і Турцыя. Буйныя партыі накіравалі ў Кітай, пробныя — ва Узбекістан, вядзём перамовы з Арменіяй. За час работы распрацавана 500 гектараў палёў — цяпер іх 1000.*

На рэкультываваных пасля здабычы торфу палях спецыялісты вырошчваюць буякі. Такі вопыт распачаты сумесна з вучонымі Акадэміі навук і Батанічнага саду. З 2010 года вопытная работа пачалася, і цяпер у торфапрадпрыемства тры тысячы кустоў на трох гектарах. З часам, магчыма, выйдуць на прамысловы ўзровень і, акрамя прыроднага торфу, змогуць прапанаваць пакупнікам і натуральную ягаду.

*— Такім чынам, палі занятыя, абаронены ад узгаранняў, даюць эканамічны прыбытак праз ягады, так што гэта беражлівае выкарыстанне тэрыторый. Новых палёў пакуль не будуем.*

### 100 ТАРФЯНЫХ РЭЦЭПТАЎ

Спецыялісты «Віцебскторф» нарыхтоўваюць тарфяную прадукцыю грунтавой групы, якая выкарыстоўваецца ў сельскай гаспадарцы і спажыўцамі для вырошчвання раслін. Гэта прэміяльны сегмент не толькі беларускага рынку, але і міжнароднага, заўважыла **Вольга ПРУДНІКАВА, намеснік міністра энергетыкі**:

*— Акрамя непаліўнай групы, «Белпаліўгаз» вырабляе і торф паліўнай групы, які выкарыстоўваецца для дыверсіфікацыі паліўна-энергетычнага балансу краіны, каб выйсці на прагнозныя паказчыкі энергетычнай незалежнасці. Сёння чарговы раз змянілася кан'юнктура ў тым ліку і міжнароднага рынку. З аднаго боку, папулярная аднаўляльная энергетыка: сонца, вецер, вада, драўніна. Аднак і мясцовыя віды паліва ў выглядзе паліўнай тарфяной групы таксама сталі папулярныя ва ўсім свеце.*

Тарфяныя брыкеты пастаўляюцца ў асноўным на цэментныя заводы, насельніцтву і іншым арганізацыям. Новы від прадукцыі «Белпаліўгаз» — тарфяная сушонка, дзякуючы якой замяшчаецца вугаль, што імпартуецца. Покрыўныя грунты для вырошчвання грыбоў спрабуюць выраблять у «Брэстаблгазе». А ў перспектыве разглядаюць стварэнне касметычнага напрамку, бо торф утрымлівае мноства мікраэлементаў, карысных для арганізма, дадала яна.

На прадпрыемстве «Віцебскторф» тарфагрунты вырабляюць з 1986 года. Цяпер тут больш за 60 найменняў, а ўвогуле тарфяная прадукцыя «гатуецца» звыш як па 100 рэцэптах. Карысны субстрат вырабляюць з кампанентаў верхавога торфу, куды ўносяць удабрэнні і дабаўкі.

*— Кіслотнасць яго 2,5, няма ні патагенаў, ні грыбкоў, ні зелля. Яго выкарыстоўваюць на патрэбы сельскай гаспадаркі, але не як раней — для паляпшэння ўрадлівасці глебы, а на вытворчасць сілкавальных грунтоў, высадку ў лясных гаспадарках раслін з закрытай каранёвай сістэмай,* — агучыў Віталь Неспляк.

На заводзе па перапрацоўцы верхавога фрэзернага торфу ў аграгарадку Крулеўшчына атрыманая на палях сыравіна ачышчаецца ад дамешкаў. Для розных грунтоў неабходны пэўны склад торфу, які вырабляецца індывідуальна пад кожную культуру.

*— На лініі змешвання атрыманыя розныя фракцыі торфу змешваюцца з іншымі інгрэдыентамі, дадаюць перліт, пры неабходнасці, мінеральныя ўгнаенні. Пасля ўсё паступае ў змешвальнік і ўпакоўваецца ў біг-бойлы па шэсць кубоў.*

Для спажыўцоў гатовыя грунты прапануюцца ва ўпакоўках ад пяці да 55 літраў. У іх можна высаджваць насенне і паліваць, ніякіх дадатковых рэчываў не патрэбна. Асобна прадаюць пакеты па 100 літраў, якія прызначаны спецыяльна для паляпшэння структуры глебы.

### ШМАТСТУПЕНЬЧАТАЯ ТЭХНАЛОГІЯ

Адно з радовішчаў філіяла плошчай 70 гектараў, дзе здабываюць верхавы, разны і павышанай ступені раскладання торф, — «Жураўлёўскае». Да яго ад завода па вузкакалейцы 13 кіламетраў, плюс пяць кіламетраў так званых часовых шляхоў, якія «раскладваюцца» па палях у залежнасці ад месца здабычы сыравіны. Тут здабываюць 68 тысяч тон торфу, і яго запасаў хопіць яшчэ на 60 гадоў работы, расказаў дырэктар.

**З аднаго боку, папулярная аднаўляльная энергетыка: сонца, вецер, вада, драўніна. Аднак і мясцовыя віды паліва ў выглядзе паліўнай тарфяной групы таксама сталі папулярныя ва ўсім свеце.**

Тарфянік «Жураўлёўскае» цягнецца на пяць кіламетраў. Для будаўніцва часовых шляхоў на палях і ацяплення спецыялісты выкарыстоўваюць драўляныя тысячагадовыя карчы, якія сустракаюцца ў зямлі падчас здабычы торфу. З падрыхтаванай да здабычы паверхні радовішча штогод здымаюць каля 10 сантыметраў слою. На «Жураўлёўскім» глыбіня карыснага слою выкапняў дасягае шасці метраў.

Як кажа дырэктар, тарфянік пачынаецца з каналаў. Тут працуе замежны каналакапальнік, які мясцовыя спецыялісты «паставілі на 12 колаў», каб ён мог працаваць з трактарам «Беларус». Цяпер мадэрнізаваны агрэгат замяняе чатыры экскаватары. Штогод плошчы карчуюць і рыхтуюць да прафілявання.

*— Мы сабралі ў сябе ўсе тэхналогіі і з улікам імпартных аналагаў і ўласных асаблівасцяў зрабілі тэхналагічнае абсталяванне для работы на палях. Каб забяспечыць сцёк вады, выкарыстоўваюць броўкарэзы. Гэтыя агрэгаты — аналагі фінскага, якія мадэрнізаваны спецыялістамі нашага філіяла і вырабляюцца ў Беларусі. Прычым па кошце яны ўдвая таннейшыя за замежныя,* — паказаў тэхніку ў рабоце дырэктар. *— Профіль паверхні карты павінен забяспечваць ухіл, таму сетка разлічана такім чынам, каб уся паверхневая вада накіроўвалася ў водапрыёмнік.*

Верхавы торф здабываецца па шматступеньчатай тэхналогіі. Каб атрымаць якасныя залежы, выкарыстоўваюцца пасіўныя прэс-барабаны. Гэтая тэхніка аналагічная латвійскім агрэгатам і дазваляе атрымліваць торф кавалкамі. Яны далей не падвяргаюцца ніякаму тэхналагічнаму ўздзеянню, выбіраюцца пнеўмамашынамі і ідуць на перапрацоўку.

Наступная машына — разбівалка — таксама цалкам распрацавана айчыннымі спецыялістамі. Яна пераварочвае торф, каб ён хутчэй падсыхаў, што павялічвае вытворчасць працы ўдвая. Спецыяльны камбайн, які робіць валок, на гумавай хадзе, — яшчэ адна створаная беларусамі машына, якая пакуль працуе толькі на палях віцебскіх торфаздабытчыкаў. Дзякуючы ўсім гэтым агрэгатам і тэхналогіям можна атрымліваць прадукт нізкай вільготнасці і большага аб'ёму, рэзюмаваў Віталь Неспляк.

Здабыча разнога торфу — працэс працаёмкі. Дзякуючы мадэрнізацыі завода ў 2018 годзе спецыялісты навучыліся не толькі здабываць некранутыя залежы, але і перапрацоўваць. Закрытая структура захоўвае ўсе карысныя ўласцівасці торфу, і яго вільгацеёмістасць у тры-чатыры разы большая, чым у здабытага фрэзерным спосабам.

*— Разны торф — аснова прафесійнага рынку. Усе грунты, якія мы прадаём насельніцтву, 10 % — менавіта разны торф, нягледзячы на тое, што яго сабекошт утрая вышэйшы,* — падкрэсліў дырэктар філіяла. *— Здабываем торф і высокай ступені раскладання, выкарыстоўваючы ўсе магчымасці, якія ёсць у радовішча.*

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

# ЗАБЫТЫЯ ГЕРОІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

З першых дзён вайны ўся сям'я Васіля Захаравіча ўключылася ў падпольную работу: жонка, Юлія Ярчак, і два непаўналетнія сыны — Георгій і Уладзімір. Да дзейнасці патрыётаў падключыліся і супрацоўнікі інфекцыйнай бальніцы, якая стала эпіцэнтрам падпольнай барацьбы групы Клімука. Сёння пра гераічныя ўчынкі гэтых людзей мала хто ведае. І калі б не асобныя людзі, сярод якіх у першую чаргу ўнукі падпольшчыка, подзвіг патрыётаў быў бы забыты. Карэспандэнты «Звязды» сустрэліся з Васілём і Андрэем Клімукамі, каб даведацца аб іх легендарным продку і яго баявых таварышах.

**Немцы вельмі баяліся інфекцыйных хвароб, таму бальніца з'яўлялася тым з нямногіх месцаў у Мінску, куды яны амаль не заходзілі. Калі лютаваў тыф, гітлераўцы ўвогуле абыходзілі яе бокам. Гэта было толькі на руку падпольшчыкам.**

## ЮНЫЯ ПАДПОЛЬШЧЫКІ

Гутарку з нашчадкамі падпольшчыка мы пачалі на Вайсковых могілках Мінска — менавіта тут, у брацкай магіле, пахаваны іх дзед. Разам з таварышамі па падполлі Васіль Клімук быў арыштаваны гітлераўцамі і 6 лістапада 1943 года публічна павешаны ў раёне вадапампавай станцыі № 1 у Навінках. Патрыёты віселі некалькі дзён, пакуль іх не дазволілі пахаваць на тэрыторыі станцыі. Пасля вызвалення Мінска падпольшчыкам знайшлі прыстойнае месца спачыну на Вайсковых могілках. Магіла дагледжаная. Аб гэтым клапоцяцца як адміністрацыя могілак, так і сваякі загінулых. Нават падчас нашай сустрэчы, перш чым ускласці кветкі, унукі Васіля Клімука навялі тут парадак. Яны ніколі не бачылі свайго дзеда-героя, аднак гэта ніколькі не перашкаджае ім берагчы памяць аб сапраўдным патрыёце сваёй Айчыны.

Хата, у якой жылі Клімукі, згарэла ў першы дзень бамбёжкі Мінска. Сям'я вымушана была шукаць прытулку то ў сваякоў, то ў знаёмых. Жылі і ў пустых хатах, спехам пакінутых гаспадарамі, у прыватнасці на Старавіленскай. «Аднойчы мой бацька разам з братам залезлі ў адчыненае акно будынка на тэрыторыі нямецкай воінскай часці (сучаснае суворауўскае вучылішча) і забралі ў іх радыёпрыёмнік, — расказвае ўнук і сын падпольшчыкаў Андрэй Клімук. — А паколькі размова ідзе аб 1941 годзе, калі радыёпрыёмнікі былі на вагу золата і карыстацца імі насельніцтву забаранялася, то гэты ўчынак быў варты сапраўдных патрыётаў». У далейшым радыёпрыёмнік выкарыстоўваўся падпольшчыкамі для праслухоўвання зводак Саўінфармбюро. На аснове атрыманай інфармацыі яны стваралі лістоўкі, якія самі і распаўсюджвалі па горадзе.

Нягледзячы на юны ўзрост, сыны Васіля Клімука выконвалі і больш сур'ёзныя даручэнні. У ліпені 1941 года Уладзімір і Георгій, якім на пачатак вайны было па 11 і 10 гадоў адпаведна, па некалькі разоў на дзень насілі ў лагер для ваеннапалонных ваду: у бутэльках, банках, іншым посудзе. Калі атрымлівалася, перадавалі праз агароджу палонным чырвонаармейцам і нешта з ежы. Некалькі разоў падлеткі хадзілі з бацькам і на біржу працы, дзе заўсёды было шмат людзей. Ім гэта акурат і трэба было — у гэтым натоўпе непаўналетнія падпольшчыкі незаўважна распаўсюджвалі лістоўкі.

Унукі кіраўніка падпольнай групы Васіль і Андрэй КЛІМУКІ шануюць памяць свайго дзеда.

— Бацька расказваў, што разам з іншымі юнымі патрыётамі некалькі разоў ім даводзілася перапраўляць праз раку Свіслач грамадзян яўрэйскай нацыянальнасці, якія вярталіся з горада ў гета, — успамінае Васіль Клімук, цёзка свайго дзеда — кіраўніка падпольнай групы. — Не раз яны былі сведкамі таго, як немцы і іх памагатыя затрымлівалі грамадзян, забіралі ў іх ежу, здабытую цяжкай працай, і кідалі яе ў ваду. Затрыманых часта білі, пад ударамі прыкладаў прымушалі танцаваць на месце, залазіць на парэнчы і ісці па іх, пасля чаго стралялі. Хлопцы неаднойчы дзяжурылі на яўках падпольшчыкаў, распаўсюджвалі забароненую літаратуру, перадавалі ў партызанскі атрад медыкаменты...

Удзельнікамі партызанскага руху ў гады Вялікай Айчыннай вайны Уладзімір і Георгій Клімукі былі прызнаныя толькі ў 2001 годзе.

## ПАД ДАХАМ БАЛЬНІЦЫ

Іх бацька, Васіль Клімук, падчас акупацыі Мінска ўладкаваўся ў інфекцыйную бальніцу намеснікам дырэктара па гаспадарчай частцы. І закіпела падпольная дзейнасць. Патрыёты, большасць з якіх з'яўляліся супрацоўнікамі медустановы, здабывалі каштоўныя звесткі аб фашыстах, перадавалі ў партызанскія атрады медыцынскае абсталяванне, неабходныя матэрыялы, медыкаменты. Ваеннапалонных, якія ляжалі ў бальніцы пад выглядам хворых (некаторыя сапраўды былі з раненнямі), пераапраналі ў грамадзянскую вопратку і праз шчыліну ў заборы выводзілі, хавалі ў сваіх кватэрах, затым дапамагалі ім сыходзіць у партызанскія атрады. Каб не выклікаць падазрэння ў гітлераўцаў, гэтых людзей афармлялі як памерлых. Ратавалі ад вывазу ў Германію і моладзь, выдаючы ім даведкі аб наяўнасці той ці іншай хваробы, — дзякуючы падпольшчыкам вялікая колькасць маладых людзей пазбегла рабства. Немцы вельмі баяліся інфекцыйных хвароб, таму бальніца з'яўлялася тым з нямногіх месцаў у Мінску, куды яны амаль не заходзілі. Калі лютаваў тыф, гітлераўцы ўвогуле абыходзілі яе бокам. Гэта было толькі на руку падпольшчыкам.

Інфекцыёнка стала дахам над галавой не толькі для хворых і тых, хто хаваўся ад нямецкай улады. Многія супрацоўнікі жылі тут сем'ямі: іх хаты і маёмасць згарэлі. Медперсанал працаваў не складаючы рук. Нягледзячы на тое, што большасць хворых былі выпісаны, заставаліся вельмі цяжкія пацыенты. Адразу пачалі паступаць параненыя, абпаленыя — раз за разам у горадзе ўспыхвалі пажары. Карпусы бальніцы былі занятыя для шпіталізацыі савецкіх ваеннапалонных з інфекцыйнымі захворваннямі. Асобны корпус нямецкімі ўладамі быў пакінуты для шпіталізацыі грамадзянскага насельніцтва.

— Ваеннапалонных у бальніцу прыганялі як скаціну, цяжкіх хворых прывозілі грузавымі машынамі або фургонамі і выгружалі на алеях, пры гэтым не звяртаючы ўвагу на колькасць месцаў, — расказвае **галоўны ўрач Гарадской клінічнай інфекцыйнай бальніцы Мінска Мікалай ЮРОЎСКІ**. — Дзяжурныя ўрачы і медыцынскія сёстры запісвалі ўсіх хворых адразу ў дварэ і пасля прымітыўнай апрацоўкі змяшчалі на койкі або матрацы на падлозе. У бальніцы аказаўся вялікі недатыкальны запас коек і бялізны, што дало магчымасць абслугоўваць каля тысячы хворых. Гэта былі салдаты і афіцэры, галодныя, змучаныя, з цяжкімі дызентэрыямі, тыфозныя пацыенты, хворыя на слупняк адначасова з раненнямі. Смяротнасць была высокая. Хворыя паміралі каля карпусоў, некаторым нават не паспявалі аказаць дапамогу. Лячэнне праводзілася даваеннымі запасамі медыкаментаў. Харчаванне было дрэннае. Прадукты адпускаліся недабраякаснымі, па бедных нормах.

**Ваеннапалонных, якія ляжалі ў бальніцы пад выглядам хворых (некаторыя сапраўды былі з раненнямі), пераапраналі ў грамадзянскую вопратку і праз шчыліну ў заборы выводзілі, хавалі ў сваіх кватэрах, затым дапамагалі ім сыходзіць у партызанскія атрады. Каб не выклікаць падазрэння ў гітлераўцаў, гэтых людзей афармлялі як памерлых.**

Аднак, нягледзячы на такую абстаноўку, персаналу ўдавалася выходжваць людзей, у тым ліку з цяжкімі захворваннямі. Пры гэтым ва ўмовах жорсткага фашысцкага рэжыму большасць супрацоўнікаў патрыётамі. У прыватнасці, загадчыца пральні Анісіна зберагла сцяг бальніцы, партрэт Леніна. А медыцынская сястра па прозвішчы Жлоба, за чыю галаву фашысты абяцалі буйную ўзнагароду, і іншыя медсёстры выратавалі дзясяткі савецкіх людзей.

Група Васіля Клімука рыхтавала падрыў вадапампавай станцыі ў Навінах, якая забяспечвала акупантаў пітной вадой. На станцыю былі ўладкаваны свае людзі, дастаўлены скрыні са ўзрыўчаткай, падпольшчыкі падрыхтавалі план сыходу ў партызанскую зону. Аднак, як гэта часта бывае, знайшоўся здраднік, і гітлераўцам стала вядома аб дыверсіі, якая рыхтуецца на станцыі. Тых, хто трапіў пад падазрэнне, арыштавалі. Сярод іх аказаўся і кіраўнік падпольнай групы Васіль Клімук. Разам з Мікалаем Гудам, Іванам Сіткевічам і Барысам Грынкевічам ён быў публічна павешаны нямецкімі карнымі органамі 6 лістапада 1943 года на тэрыторыі вадапампавай станцыі.

Кіраўнік падпольнай групы Васіль Клімук з жонкай і дзецьмі. (Гэты фотаздымак працяглы час знаходзіўся ў экспазіцыі старога будынка Белдзяржмузея Вялікай Айчыннай вайны. Прыпераездзе ён быў страчаны. У новай экспазіцыі музея — ні слова пра дзейнасць падпольнай групы Клімука).

На жаль, прозвішчы некаторых герояў забытыя. Каб выправіць гэтую гістарычную несправядлівасць, а таксама ўвекавечыць подзвіг падпольнай групы Васіля Клімука, якая дзейнічала тут са жніўня 1941 года да лістапада 1943 года, на тэрыторыі Гарадской клінічнай інфекцыйнай бальніцы плануюць устанавіць мемарыяльны знак. «Сучасныя беларусы павінны ведаць прозвішчы гэтых людзей, — перакананы галоўны ўрач медустановы. — Асабліва гэта датычыцца моладзі. Невыпадкова да патрыятычнай работы мы падключаем маладых людзей, якія прыходзяць працаваць у бальніцу. На такіх момантах акурат і выхоўваецца пакаленне, фарміруюцца правільныя адносіны да таго, што цяпер адбываецца. Без гістарычнай памяці чагосьці дасягнуць, ісці далей немагчыма».

**Яны ніколі не бачылі свайго дзеда-героя, аднак гэта ніколькі не перашкаджае ім берагчы памяць аб сапраўдным патрыёце сваёй Айчыны.**

## НА ВАЧАХ У ЖОНКІ І ДЗІЦЯЦІ

Не толькі на тэрыторыі інфекцыйнай бальніцы здзяйснялі подзвігі падпольшчыкі групы Клімука. Дзейнічалі патрыёты і па-за межамі медыцынскай установы. Адна з дыверсій, якую так і не ўдалося ажыццявіць, стала для некаторых падпольшчыкаў трагічнай.

Пасля вызвалення Мінска ў бальніцы знайшлі дакументы, якія пацвердзілі, што Васіль Клімук быў арыштаваны гітлераўцамі ў ліпені 1943 года. Яго жонка і малодшы сын, якія там былі, сказалі маёй бабулі тэрмінова пераязджаць з кватэры, дзе яны жылі. Ледзьве паспелі — праз дзве гадзіны, як яна з дзецьмі пакінула кватэру, туды прыйшлі паліцаі...

У лепшым выпадку сям'ю кіраўніка падпольнай групы чакаў канцлагер. Аднак абышлося. Выжываць у акупаваным горадзе, дзе ўдаву з трыма дзецьмі шукалі гітлераўцы, было няпроста. Дапамагалі добрыя людзі. Вызвалення чакалі з нецярпеннем. І прычакалі! Няпроста было і пасля вайны — будаваць наноў жыццё, адной падымаць дзяцей. І ў яе гэта атрымалася — як у народзе кажуць, усе выбіліся ў людзі.

У 1984 годзе на месцы вадапампавай станцыі, дзе былі пакараны падпольшчыкі, з'явіўся помнік. Цяпер гэта тэрыторыя аднаго з аб'ектаў Мінсквадаканала. Супрацоўнікі ўнітарнага прадпрыемства даглядаюць помнік, рэгулярна ўскладаюць да яго кветкі — такім чынам шануюць памяць гэтых адважных людзей, сваіх калег (да вайны Васіль Захаравіч Клімук з'яўляўся намеснікам дырэктара Мінскводаканала), імёны якіх упісаны ў гісторыю арганізацыі. І, несумненна, у гісторыю Беларусі.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота аўтара і з асабістага архіва сям'і Клімукоў.**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению Коммунального дочернего унитарного предприятия «Кинотехпром» (продавец) в лице председателя ликвидационной комиссии Саковича В.П. извещает о проведении 26 сентября 2022 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 30 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Условие продажи: по лотам №№ 1, 2, 3, 5:** затраты по переоформлению документов на переход права собственности возлагаются на Покупателя. **По лоту № 4:** действия по снятию с регистрационного учета транспортного средства, а также в случае необходимости получения регистрационных документов (при их отсутствии у Продавца) производятся Покупателем за его счет и его силами на основании доверенности, выданной Продавцом. Переоформление документов на автотехнику и механизмы производится за счет Покупателя | | | |
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 350/С-81185**, общей площадью **3 264,4** кв. м, назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **здание административно-хозяйственное. Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Федюнинского, 10. **Капитальное строение с инв. № 350/С-167549**, общей площадью **7,7** кв. м, назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **здание административно-хозяйственное (проходная). Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Федюнинского, 10/2. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **340100000002006414** общей площадью **0,2036 га (право постоянного пользования). Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Федюнинского, 10. **ПОДРОБНЫЙ ПЕРЕЧЕНЬ ИМУЩЕСТВА (ЛОТ № 1) размещен на сайте Организатора торгов www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы»** | 1 343 417,03 | **134 341,70** |
| 2 | **Капитальное строение с инв. № 350/С- 169247**, общей площадью **248,3** кв. м, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Федюнинского, 10/3. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **340100000002006415** общей площадью **0,0395 га (право постоянного пользования). Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Федюнинского, 10/3. Сооружение – часть дворового покрытия, инв. № 01361031 (площадью 121,0 кв. м) | 54 392,24 | **5 439,22** |
| 3 | **Капитальное строение с инв. № 350/С-189028**, общей площадью **0,0** кв. м, назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, наименование – **склад металлический. Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Федюнинского, 10. **Капитальное строение с инв. № 350/С-189030**, общей площадью **0,0** кв. м, назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – **площадка бетонная с металлическим ограждением** (материал покрытия бетон, ограждение проволочное, высота 1,4 м, длина 7,4 м)**. Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Федюнинского, 10. **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **340100000002006416** общей площадью **0,0274 га (право постоянного пользования). Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Федюнинского, 10/3. Сооружение – часть дворового покрытия инв. № 01361031 (площадью 123,0 кв. м) | 41 920,02 | **4 192,00** |
| 4 | Автомобиль GAZ-3110, рег. № 2880 ЕМ-3, 2000 г.в., тип – легковой седан, МКПП, тип двигателя – бензиновый, пробег – 265 039 км, состояние – неудовлетворительное | 672,00 | **67,20** |
| 5 | Сооружение – часть дворового покрытия, инв. № 01361031 (площадью 409,0 кв. м) | 43 307,51 | **4 330,75** |

**Продавец:** Коммунальное дочернее унитарное предприятие «Кинотехпром», 246007, г. Гомель, ул. Федюнинского, д. 10.

Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел. **8 (029) 647-81-95 – Сакович Вадим Павлович.**

**Шаг аукционных торгов –** 5 (пять)% от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 13 сентября 2022 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 22 сентября 2022 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.**

Да тэмы абароны горада ад агню ў першай палове XIX стагоддзя звярнуўся мінскі даследчык Андрэй Гоцін. Так, у мінулых стагоддзях горад часта гарэў, і, як ні дзіўна, перавярнуць сітуацыю ўдалося пасля адной з найбуйнейшых катастроф — 30 мая 1835 года, калі згарэла добрая частка горада з кварталамі Верхняга і Нізкага рынку, вуліц Кацярынінскай, Францысканскай, Захар'еўскай і іншых. Калі паліцмайстар паспрабаваў далажыць пра надзвычайную сітуацыю губернатару, апошні публічна сарваў з мундзіра «дакладчыка» эпалеты. Абсталяванне пажарнага абозу не спрацавала — яно папросту было няспраўным: некаторым інструментам карысталіся ўжо пад 40 гадоў. Губернатар горада дае распараджэнне аб закупцы найноўшага абсталявання ў Санкт-Пецярбургу. Да таго ж вырашаецца папоўніць «штаты», далучаць у час пажараў да іх тушэння каманды ліхтаршчыкаў, якіх у вольны час спецыяльна навучаюць такой справе. Калі раней пажарныя знаходзіліся далёка ад цэнтра горада, то пасля рэформы размяшчаюцца ў новым будынку — спачатку арандаваным, а пасля пабудаваным адмыслова. Ужо ў 1844 годзе з'яўляецца сучаснае пажарнае дэпо, якім ганарыцца горад. З супрацоўнікамі праводзяцца практычныя заняткі, вучэбныя трывогі, адпрацоўваецца магчымасць пажаратушэння новых высокіх дамоў, дзе воду трэба пастаўляць на трэці паверх. Станаўленне прафесійнай службы на поўным казённым утрыманні вызваліла гараджан ад пажарнай павіннасці — калі ў час катастроф яны мусілі дапамагаць у тушэнні.

Шмат удзялялася ўвагі і пажарнаму апавяшчэнню. Так, на вежы ратушы пасля пажару 1835 года быў усталяваны пажарны сігнал і пост для назірання за сітуацыяй у горадзе. Напачатку звесткі пра пажары перадаваліся пры дапамозе каляровых сцягоў, а ўначы — ліхтароў. Па колерах можна было зразумець, у якім квартале адбылося ўзгаранне. Але ў дрэннае надвор'е сцягі павісалі, не распраўляліся. Таму іх замянілі на сігнальныя шары.

Таксама пажарную тэму выбраў для выступлення доктар гістарычных навук прафесар Эмануіл Іофе. Ён спрабуе высветліць абставіны адной з найжахлівейшых катастроф у праслаўленным Мінску. На навагоднім касцюміраваным балі 3 студзеня 1946 года, што праходзіў на плошчы Свабоды, з 500 запрошаных хлопцаў і дзяўчат, навучэнцаў старшых класаў сталічных школ і тэхнікумаў згарэла амаль палавіна. Пра жахлівую трагедыю, у якой загінулі прадстаўнікі найлепшай моладзі, выдатнікі вучобы, не гаварыла рэспубліканскае радыё, не давалася ні радка ў газетах. Прычыны трагедыі не раскрыты да гэтага часу. Сярод версій аб узнікненні пажару найбольш папулярныя тры: кароткае замыканне, неасцярожнае абыходжанне з агнём (сведкі, якім удалося выжыць, згадваюць, што пажар пачаўся пасля таго, як яны бачылі каля навагодняй ёлкі сына Панамарэнкі і яго сяброў з запальніцамі). Трэцяя версія — дзеянні нямецкай агентуры. Баль адбываўся ў клубе КДБ, дзе ў сутарэннях у патаемным пакоі захоўваліся засакрэчаныя дакументы са звесткамі пра нямецкую агенту-ру, задзейнічаную ў гады вайны. Эмануіл Рыгоравіч паспеў сустрэцца са сведкамі трагедыі. Сярод іх быў і Нобелеўскі лаўрэат Жарэс Алфёраў, яму тады, старшакласніку сталічнай школы, удалося выжыць.

### ДЗЕЛАВЫЯ ЛЮДЗІ

Доктар гістарычных навук, загадчыца кафедры эканамічнай гісторыі Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта Наталля Палятаева прысвяціла даследаванне прадпрымальнікам 20-х гадоў XX стагоддзя. Пераліс 1923 і 1926 гадоў дазваляе высветліць, якімі былі заняткі і заробкі жыхароў горада. Практычна кожны дзясяты мінчанін у часы НЭПа быў уцягнуты ў прадпрымальніцкую дзейнасць. Можна прасачыць, хто выкарыстоўваў наёмную сілу, хто працаваў з членамі сям'і, а хто быў, так бы мовіць, індывідуальным прадпрымальнікам. Захаваны звесткі, якіх нацыянальнасцяў былі гэтыя людзі і чым займаліся да рэвалюцыі. Пераважна прадпрымальніцтва было мужчынскай справай — 77 працэнтаў занятых былі моцнага полу. Жанчыны даганялі іх толькі ў гандлі — ды ў гэтай сферы дамам удалося перахапіць толькі 44 працэнты.

А вось Алена Сакольчык, кандыдат гістарычных навук, старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі, сваё выступленне прысвяціла «прадпрымальнікам» іншага роду — «рыцарам зялёнага поля». Так у XIX стагоддзі называлі картачных шулераў. Назва пайшла ад зялёнага колеру сталоў. У той час у карты гулялі жанчыны і мужчыны, прадстаўнікі розных прафесій і ўзростаў, нават малыя, якія яшчэ не навучыліся вызначаць, дзе права і лева, без памылак называлі картачныя масці.

У канцы XIX стагодзя ў судзе разглядалася сенсацыйная справа, следчы працэс цягнуўся некалькі гадоў, усплывалі ўсё новыя выпадкі махлярства. А пачалося ўсё з простай заявы пакрыўджанага чалавека, якога абыгралі ў карты. Мужчына чакаў цягніка на вакзале ў Мінску, калі яго ўзялі ў абарот картачныя шулеры. Як пазней высветлілася, яны з немалым барышом дзейнічалі на розных чыгуначных станцыях, у тым ліку ў Маскве і Ноўгарадзе, мянялі знешнасць, прыдумвалі сабе амплуа, выкарыстоўвалі псіхалагічныя прыёмы, каб увайсці ў давер да будучых ахвяр. Так праз адну судовую справу можна даведацца пра жыццё горада, работу паліцэйскіх службаў, суда. А колькі яшчэ неразгледжаных дакументаў чакаюць сваіх даследчыкаў у архівах!..

**Ганна ПЯТРОВА,**
**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ

## Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП» 05 октября 2022 в 14.00 проводит повторные торги по продаже следующих объектов

### ЛОТ № 1: КОМПЛЕКС ИМУЩЕСТВА В СОСТАВЕ:

| № п/п | Наименование | Наименование основных средств | Инвентарный номер | Дата ввода в эксплуатацию |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Недвижимое улучшение: капитальное строение с инвентарным номером 730/С-184, назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – здание заводоуправления с пристройкой, общей площадью 2571,5 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., Кричевский район, г. Кричев, ул. Зеленая. В том числе: | | | |
| | Здание заводоуправления | Здание заводоуправления, инв. № кап. стр. 730/С-184, г. Кричев, ул. Зеленая | 00110077 | Декабрь 1948 года |
| 2 | Пристройка к зданию заводоуправления | Пристройка к зданию заводоуправления, инв. № кап. стр. 730/С-184, г. Кричев | 00110088 | Март 1986 года |
| 3 | Насаждения ограниченного пользования, расположенные по адресу: Могилевская обл., Кричевский район, г. Кричев, ул. Зеленая (зеленые насаждения: туи, кустарники, деревья) | Насаждения ограниченного пользования | 00970243 | июль 2010 года |

**Начальная цена продажи лота № 1 снижена на 60 % и с учетом НДС (20 %) составляет: 196 416,00 (сто девяносто шесть тысяч четыреста шестнадцать белорусских рублей 00 копеек), задаток 19 641,60 бел. руб. (девятнадцать тысяч шестьсот сорок один белорусский рубль 60 копеек).**

### ЛОТ № 2: КОМПЛЕКС ИМУЩЕСТВА В СОСТАВЕ:

| № п/п | Наименование | Наименование основных средств | Инвентарный номер | Дата ввода в эксплуатацию |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | | 3 | 4 |
| 1 | Недвижимое улучшение: капитальное строение с инвентарным номером 730/С-303, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – здание овощехранилища общей площадью 32,1 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., Кричевский район, г. Кричев, ул. Зеленая | Здание овощехранилища, инв. № кап. стр. 730/104-9283, г. Кричев | 00110111 | Август 2004 |
| 2 | Недвижимое улучшение: капитальное строение с инвентарным номером 730/С-12784, назначение – здание специализированное для общественного питания, наименование – здание столовой общей площадью 1329,1 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., Кричевский район, г. Кричев, ул. Зеленая | Здание столовой, инв. № кап. стр. 730/104-9290, г. Кричев, ул. Зеленая, д. 4 | 00110080 | Ноябрь 1981 |
| 3 | Недвижимое улучшение: капитальное строение с инвентарным номером 730/С-13142, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – ограждение столовой декоративное металлическое общей протяженностью 38 м, расположенное по адресу: Могилевская обл., Кричевский район, г. Кричев, ул. Зеленая, д. 4 | Ограждение столовой декоративное металлическое, 730/С-13142 | 00220159 | Декабрь 2007 |
| 4 | Недвижимое улучшение: капитальное строение с инвентарным номером 730/С-13334, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – ограждение столовой общей протяженностью 64,1 м, расположенное по адресу: Могилевская обл., Кричевский район, г. Кричев, ул. Зеленая, д. 4. В том числе: | | | |
| | Ограждение столовой (ж/б) | Ограждение столовой (ж/б), инв. № кап. стр. 730/С-13334, г. Кричев | 220082-1 | Август 2004 |
| 5 | Ограждение столовой | Ограждение столовой, инв. № кап. стр. 730/С-13334) | 00220082 | Август 2004 |
| 6 | Недвижимое улучшение: капитальное строение с инвентарным номером 730/С-13143, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – ограждение столовой ж/б декоративное общей протяженностью 105 м, расположенное по адресу: Могилевская обл., Кричевский район, г. Кричев, ул. Зеленая, д. 4 | Ограждение столовой ж/б декоративное, инв. № кап. стр. 730/С-13143 | 00220158 | Декабрь 2007 |
| 7 | Насаждения ограниченного пользования, расположенные по адресу: Могилевская обл., Кричевский район, г. Кричев, ул. Зеленая | Насаждения ограниченного пользования | 00970245 | Июль 2010 |
| 8 | Печь ротационная (хлебопечка), 1996 год выпуска | Печь ротационная (хлебопечка) | 00440673 | Январь 1999 |
| 9 | Плита электрическая промышленная ПЭМ4-010, 2009 год выпуска | Плита электрическая промышл. ПЭМ4-010 | 00445053 | Сентябрь 2009 |
| 10 | Плита электрическая промышленная ПЭМ4-010, 2009 год выпуска | Плита электрическая промышл. ПЭМ4-010 | 00445054 | Сентябрь 2009 |
| 11 | Плита электрическая промышленная ПЭМ4-010, 2009 год выпуска | Плита электрическая промышл. ПЭМ4-010 | 00445058 | Октябрь 2009 |
| 12 | Прилавок нейтральный открытый, 2 полки, ПН-78К, 1500х1000х1400, 2014 год выпуска | Прилавок нейтральный открытый, 2 полки, ПН-78К, 1500х1000х1400 | 00461402 | Август 2014 |
| 13 | Прилавок холодильный, 2 полки, ПВВ(Н)-84К-1, 1500х1000х1400, 2014 год выпуска | Прилавок холодильный, 2 полки, ПВВ(Н)-84К-1, 1500Х1000Х1400 | 00460189 | Июнь 2014 |
| 14 | СПЛИТ KLS 218, 2012 год выпуска | СПЛИТ KLS 218 | 00445502 | Август 2012 |
| 15 | СПЛИТ KLS 220, 2012 год выпуска | СПЛИТ KLS 220 | 00445503 | Май 2012 |
| 16 | СПЛИТ KMS 107, 2012 год выпуска | СПЛИТ KMS 107 | 00445501 | Май 2012 |
| 17 | СПЛИТ KMS 120, 2012 год выпуска | СПЛИТ KMS 120 | 00445500 | Август 2012 |
| 18 | Стойка для приборов и подносов ПСПиП-1, 560х700х1130, 2014 год выпуска | Стойка для приборов и подносов ПСПиП-1560х700х1130 | 00461404 | Август 2014 |

**Начальная цена продажи лота № 2 снижена на 60 % и с учетом НДС (20 %) составляет: 113 803,20 (сто тринадцать тысяч восемьсот три белорусских рубля 20 копеек), задаток 11 380,32 бел. руб. (одиннадцать тысяч триста восемьдесят белорусских рублей 32 копейки).**

**Собственник имущества:** открытое акционерное общество «Кричевцементношифер», 213493, Республика Беларусь, Могилевская область, Кричевский р-н, Краснобудски с/с, 2, АБК в районе месторождения «Каменка», тел. +375224120909, тел. для осмотра объектов продажи +375224120914.

**Организатор торгов:** Унитарное предприятие по оказанию услуг «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты», г. Могилев, ул. Циолковского, 1.

**Место проведения торгов:** г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112, Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Лоты № 1–2 продаются без условий на торгах в форме открытого аукциона с применением метода повышения начальной цены с шагом 5 (пять) процентов от предыдущей названной аукционистом цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, представившие организатору торгов, в сроки, указанные в извещении, следующие документы: заявление на участие в торгах; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения торгов; соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения торгов (в двух экземплярах); копию платежного поручения о внесении задатка, заверенную банком. Задаток перечисляется на расчетный счет Унитарного предприятия «Могилевское отделение БелТПП» р/с № BY55PJCB30123018571000000933 в «Приорбанк» ОАО, ЦБУ 300 г. Могилев, BIC: PJCBBY2X, УНП 700016628; физическим лицам – предъявить паспорт; иные документы в соответствии с Положением о порядке организации и проведения торгов по продаже объектов, находящихся в собственности юридических лиц и индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь, организуемых Унитарным предприятием «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты».

Условия регистрации, участия в торгах размещены на интернет сайте продавца по адресу: www.mogilevcci.by.

**Срок заключения договора купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем)** – в течение 10 календарных дней после проведения торгов.

Срок оплаты за предметы торгов на условиях заключенного договора купли-продажи.

**Торги состоятся 05 октября 2022 г. в 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112, Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».**

Срок подачи заявления: с момента выхода публикации настоящего извещения в рабочие дни с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 15.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 104. **Последний срок подачи заявления – 04 октября 2022 до 12.00.**

Регистрация участников торгов 05 октября 2022 с 13.30 до 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, к. 112, Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».

Телефоны для справок: (0222) 778042, + 375 0296927492 (А1).

Дополнительная информация размещена на сайте организатора.

*Извещения о предыдущих торгах по объектам были размещены в газете «Звязда» от 25.05.2022, 21.07.2022.*

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению Коммунального дочернего унитарного предприятия «Кинотехпром» (продавец) в лице председателя ликвидационной комиссии Саковича В.П. извещает о проведении 26 сентября 2022 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 30 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

ПОЛНЫЙ и ПОДРОБНЫЙ ПЕРЕЧЕНЬ ИМУЩЕСТВА (ЛОТЫ №№ 1–105 (автозапчасти) **размещен на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы»**

**Продавец:** Коммунальное дочернее унитарное предприятие «Кинотехпром», 246007, г. Гомель, ул. Федюнинского, д. 10.

Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел. **8 (029) 647-81-95 – Саковичу Вадиму Павловичу.**

**Шаг аукционных торгов –** 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 13 сентября 2022 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 22 сентября 2022 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.** Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения. **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того**, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату за услуги (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания договора купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с «Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (в ред. постановления Совмина от 12.07.2013 № 607).

**Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 09.06.2022 г. № 111 (29733).**

**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-53, 8 (029) 651-22-19, 8 (044) 599-18-16.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона, оператор ЭТП** | **ООО «Расантекторг», г. Минск, ул. Беды, 33, помещение 339. Адрес ЭТП: www.torgi24.by** |
| **Продавец** | **ОАО «Столбцовский РКБО» Минская область, г. Столбцы, ул. Я. Коласа, 28** |

**Предмет электронных торгов:**

| Лот | Наименование (назначение), инвентарный номер | Начальная цена с НДС (бел. руб.) |
|---|---|---|
| **889** | **Капитальное строение с инвентарным № 622/С-48035** | **74 880,00** |

**расположенные по адресу:**
Минская обл., Столбцовский р-н, ул. Социалистическая, 55, наименование – здание прачечной

**Размер шага** составляет **5 %** от начальной цены лота

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY56UNBS30120893600010000933 в ЗАО «БСБ Банк», код UNBSBY2X, г. Минск, пр-т Победителей, 23/3, УНП 191514793, получатель: ООО «Расантекторг»

**Срок подписания договора купли-продажи: 15** (пятнадцать) рабочих дней после электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан возместить затраты на проведение торгов и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **10 %** от цены продажи лота в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Затраты на организацию и проведение электронных торгов составили: по лоту – не **более 1 450,00 бел. руб.**

**Дата и время начала торгов**: **05.10.2022** в 09.00.
**Дата и время окончания торгов: 05.10.2022** в 16.00

Для участия в торгах, необходимо подать заявку и пройти регистрацию в качестве участника торгов на торговой площадке:**www.torgi24.by**. Прием документов на участие в торгах осуществляется организатором торгов ООО «Расантекторг» на электронную почту: **info@torgi24.by**. Срок приема заявлений на участие в торгах и оплаты задатка – с **13.09.2022 по 03.10.2022** с 9.00 до 17.00

**Контактные данные: +375 (29) 607-79-50; +375 (29) 607-22-87. E-mail: info@torgi24.by.**

## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» (Организатор аукциона) извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Борисовхлебпром» (Продавец)

Аукцион состоится **17.10.2022** в **11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

**Лот № 1, состав:**

**1. Здание производственного корпуса,** инв. № 620/С-33108, 1084,7 кв. м, адрес: Минская обл., Дзержинский р-н, г. Дзержинск, ул. Фоминых, 1.

**2. Здание проходной,** инв. № 620/С-33107, 25,8 кв. м, адрес: Минская обл., Дзержинский р-н, г. Дзержинск, ул. Фоминых, 1.

**3. Здание гаражей,** инв. № 620/С-33106, 140,8 кв. м, адрес: Минская обл., Дзержинский р-н, г. Дзержинск, ул. Фоминых, 1Е.

**4. Здание склада,** инв. № 620/С-33104, 339 кв. м, адрес: Минская обл., Дзержинский р-н, г. Дзержинск, ул. Фоминых, 1.

Земельные участки:
1. Кадастровый номер 622250100001002286, 0,7179 га, право постоянного пользования, доля: 22/25;
2. Кадастровый номер 622250100001005522, 0.0482 га, право аренды, срок действия: по 14.03.2121.
**Начальная цена с НДС – 694 624,56 руб.**
Задаток – 69 462,46 руб. Шаг аукциона – 5 %.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – **ino.by.** Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.
Окончание приема заявлений и задатка – **13.10.2022 в 11.00**.

**Организатор аукциона: 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

УНП 193417684

**ЗАО «БелБанкротАукцион»,**
организатор торгов по продаже имущества
**ГОУП «Лечебно-производственные (трудовые) мастерские»**
(УНП 500055202),
объявляет о проведении **23.09.2022 г.** в 09.00 публичных торгов в электронной форме.
Перечень имущества и информация об условиях торгов размещены на сайте электронной торговой площадки: **bankrottorg.by.**

# СТАЛІЦУ АБ'ЯДНАЎ АЛІМПІЙСКІ І БАЙКЕРСКІ РУХІ

**Грандыёзнымі спартыўнымі святамі Мінск ужо не здзівіць. Але кожны раз знаходзіцца нешта такое, што вылучае падзею і робіць яе незабыўнай. Маштабны алімпійскі дзень, які прайшоў у сталіцы 10 верасня, зрабілі непаўторным... байкеры.**

Закрыццё мотасезона H.O.G. Rally Minsk стала яркай часткай спартыўнага свята. Прынамсі, не заўважыць брутальных мужчын у скураных куртках і іх жалезных коней было цяжка. Свята хуткасці і спорту аб'яднала тысячы байкераў з Беларусі, Расіі, Літвы, Латвіі і Эстоніі. Раніцай суботы матацыклісты ўсклалі кветкі да Кургана Славы, а падчас праезду па праспекце Незалежнасці азнаёміліся з асноўнымі славутасцямі Мінска. А каля Палаца спорту іх чакала вялікае спартыўнае свята. Узначальваў калону матацыклістаў **прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта Віктар ЛУКАШЭНКА.**

«У байкерскім руху, як і ў спорце, развіта братэрства, узаемадапамога, павага. Калі твой сябар байкер або спартсмен трапіў у бяду, ты ніколі не пройдзеш міма, заўсёды дапаможаш і падтрымаеш. І любімая справа нас аб'ядноўвае», — падкрэсліў ён. Таксама Віктар Лукашэнка адзначыў, што цяпер, на жаль, алімпізм не аб'ядноўвае людзей так, як павінен. Але, па яго словах, ужо ёсць пэўныя зрухі ў вырашэнні цяжкай сітуацыі, якая склалася цяпер у беларускім спорце. «Самае галоўнае — каб нашы спартсмены маглі трэніравацца, выступаць і паказваць свае вынікі», — заўважыў прэзідэнт НАК.

Разам з тым беларускія спартсмены паспяваюць не толькі трэніравацца, але і адкрываць для сябе новыя заняткі. Дзякуючы алімпійскаму дню ўсе даведаліся, што **алімпійскі чэмпіён 2016 года ў скачках на батуце Уладзіслаў ГАНЧАРОЎ** не толькі выдатны спартсмен, але і байкер. «Уражанні выдатныя, але адрэналіну больш усё ж такі ў батуце. Мне вельмі падабаецца, што так шмат людзей прыйшлі на спартыўны фестываль. Хацелася б, вядома, каб быў прадстаўлены батут, але ў такіх умовах надвор'я гэта было б праблематычна», — падзяліўся чэмпіён.

**Старшыня Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Уладзімір КУХАРАЎ** звярнуў увагу, што такога незвычайнага дня горада яшчэ не было. Ён з задавальненнем адзначыў, што мінчане прыходзяць адпачыць і адначасова адкрываюць для сябе віды спорту. «Мы сёння вельмі рады, што ў дзень горада праходзіць такое выдатнае спартыўнае мерапрыемства, якое накіравана ў першую чаргу на аб'яднанне ўсіх відаў спорту. І вельмі радуе, што тут сёння шмат моладзі. І мы будзем рабіць усё для таго, каб наша моладзь актыўна займалася спортам. Мінск — горад спартыўны, з багатай спартыўнай гісторыяй, і, я думаю, такія мерапрыемствы найлепш папулярызуюць спорт», — адзначыў Уладзімір Кухараў.

Алімпійскі дзень у Мінску стаў не толькі падарункам да дня горада, але і прыгожай кропкай другога сезона спартыўна-культурнага фестывалю «Вытокі», які зноў аб'яднаў усю краіну. Сёлета свята прымалі Рэчыца, Столін, Горкі, Полацк, Копыль, Навагрудак. «Вельмі добра праходзіць фестываль. Самае галоўнае — што яго добра сустракаюць у рэгіёнах. Гэта вялікая заслуга нашага вялікага калектыву, мясцовыя ўлады вельмі дапамагалі. «Вытокі» ўдыхаюць жыццё ў невялікія гарады. Уражанні ад другога сезона засталіся самыя яркія. Мы ўсімі сіламі будзем працягваць фестываль у будучыні. Яшчэ не ведаем, у якім фармаце, але вырашым абавязкова», — падзяліўся Віктар Лукашэнка.

## Ад гімнастыкі да стральбы

Знайсці сабе заняткі па душы на свяце мог кожны. Спецыяльна для гэтага працавала больш за 50 спартыўных пляцовак, дзе кожны ахвотны мог праверыць свае сілы ў розных відах спорту, пазнаёміцца з трэнерамі і, магчыма, выбраць занятак на будучыню. І як бонус — на многіх пляцоўках можна было сустрэцца са знакамітым спартсменам, узяць у яго аўтограф, зрабіць сэлфі. Так, цэнтрам прыцягнення на пляцоўку сучаснага пяцібор'я стала **чэмпіёнка свету, бронзавы прызёр Алімпійскіх гульняў у Пекіне Настасся ПРАКАПЕНКА**. Яна расказала, што гэтым летам наведала фестываль «Вытокі» ў некалькіх гарадах, таму размах свята ў Мінску яе не здзівіў. «Я думаю, дзецям вельмі цікава паспрабаваць на сабе розныя віды спорту. Гэта выдатны спосаб правесці выхадны дзень. Дзякуй арганізатарам. Вядома, хацелася б сонейка. Але каля Палаца спорту настолькі гарачы прыём, што, я думаю, тут нікому не холадна», — адзначыла Настасся Пракапенка. Дарэчы, дзеці спартсменкі на свяце не прысутнічалі, але суботу правялі таксама спартыўна: сын Антон — на трэніроўцы па хакеі, дачка Ліза — на занятках па мастацкай гімнастыцы.

А вось дзеці вядомага гандбаліста, а зараз **старшыні Беларускай тэніснай федэрацыі Сяргея РУТЭНКІ** праз алімпійскі квэст прайшлі. «Выдатнае мерапрыемства. Гэта свята спорту, нашых традыцый, гісторыі, свята для людзей», — адзначыў ён. Разам з сынам Цімафеем на спартыўнае свята прыйшла і алімпійская чэмпіёнка 2014 года Ала Цупер. Сын фрыстайлісткі займаецца хакеем, таму на свяце яму, зразумела, больш за ўсё спадабалася хакейная пляцоўка.

Некаторыя спартсмены вырашылі на сабе праверыць розныя віды спорту. Так, **мастацкія гімнасткі Аліна ГАРНАСЬКО і Настасся САЛАС** пагулялі ў хакей, гольф, праверылі свае сілы ў веславанні і стральбе. Бронзавы прызёр Алімпійскіх гульняў у Токіа Аліна Гарнасько нават выступіла з паказальным нумарам на адкрыцці свята.

Фестываль «Вытокі» — яшчэ і пляцоўка, дзе трэнеры дзіцячых секцый маглі прыгледзець сабе будучых вучняў. Алімпійскі дзень у Мінску на стаў выключэннем. На кожнай пляцоўцы спецыялісты ўважліва назіралі за маленькімі ўдзельнікамі квэсту. «Выдатна, што алімпійскі дзень праходзіць у пачатку навучальнага года, калі ў спартыўных школ ёсць магчымасць заўважыць таленавітых, здольных дзяцей, напрыклад, як для баскетбола, высокіх. Мы на сваёй пляцоўцы праводзім турнір сярод маленькіх баскетбалістаў. 24 каманды з усёй краіны спаборнічаюць у баскетболе тры на тры. Для трэнераў гэта добрая магчымасць прагледзець будучых выхаванцаў, таму што зусім хутка мы будзем праводзіць набор у вучылішча алімпійскага рэзерву, па сутнасці, ужо пачынаем праглядаць будучыню нашых нацыянальных каманд», — адзначыла **Настасся МАРЫНІНА, генеральны сакратар — выканаўчы дырэктар Беларускай федэрацыі баскетбола.**

Спартыўнае свята каля Палаца спорта працягвалася ўвесь дзень. Завяршыўся алімпійскі дзень святочным канцэртам і неперайзыдзеным феерверкам. Хэдлайнерам вечарыны выступіў гурт «Карані» — падарунак ад НАК Беларусі.

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

# З НОВЫМ МАРШРУТАМ!

## У сталіцы прайшоў галоўны забег года

**З 2013 года немагчыма ўявіць святкаванне дня нараджэння сталіцы без Мінскага паўмарафону. Сёлета традыцыйны галоўны забег сабраў на старце 11 тысяч аматараў бегу. І нават холад, дождж і вецер не маглі іх спыніць.**

Фота БелТА.

На дыстанцыі пяць кіламетраў сярод жанчын перамагла Ілона Велікановіч, у мужчын — Вадзім Старасценка. На дыстанцыі 10 кіламетраў першымі да фінішу прыбеглі Уладзіслаў Церашонак і Таццяна Шабанава. Пераможцамі галоўнай дыстанцыі ў 21 кіламетр 97 метраў сталі расіянін Рынас Ахмадзееў, яго вынік 1 гадзіна 6 хв. 20 сек. і Марына Даманцэвіч з вынікам 1 гадзіна 16 хв. 11 сек. Спартсмены Мінскай вобласці сталі пераможцамі агульнакаманднага заліку Мінскага паўмарафону — 2022 Уладальнікам «серабра» стала каманда Мінска, на трэцім месцы — бегуны Гомельскай вобласці.

Сёлета ўпершыню за доўгі час выраша змяніць маршрут прабегу. Гэта звязана з жаданнем аўдыторыі прыўнесці навізну ў забег. Старт і фініш Мінскага паўмарафону былі дадзены каля цэнтральнай аркі Нацыянальнага алімпійскага стыдыёна «Дынама». «Траса ў прынцыпе засталася амаль такой жа, толькі, магчыма, уздымаў стала больш. Задаволена вынікам: удалося і выйграць, і па часе добра прабегчы», — пракаментавала пераможца забегу Марына Даманцэвіч.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# Калі кніга ажывае

## Выдавецкі дом «Звязда» працягвае радаваць сваіх маленькіх чытачоў літаратурнымі падарункамі

У дні святкавання 955-годдзя Мінска каля Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адбыўся фестываль дзіцячай кнігі «У гасцях у Францыска Скарыны». Дзякуючы намаганням Саюза пісьменнікаў Беларусі, які і выступіў у ролі галоўнага арганізатара акцыі, дзеці сустрэліся з пісьменнікамі, пазнаёміліся з кніжнымі навінкамі і атрымалі аўтографы. Свае кніжныя здабыткі прадставілі аўтары, чые творы ўжо сталі хрэстаматыйнымі. Сярод іх — Міхась Пазнякоў, Мікола Чарняўскі, Генадзь Аўласенка, Ніна Галіноўская. Актыўны ўдзел у свяце прынялі пісьменнікі з усіх рэгіёнаў Беларусі, дзіцячыя бібліятэкі Мінска і дзяржаўныя выдавецтвы, сярод якіх «Беларусь», «Адукацыя і выхаванне», Выдавецкі дом «Звязда». Таксама ўдзельнікі форуму пазнаёміліся з ілюстратарамі і даведаліся, як жывуць кнігі. Паўдзельнічалі ў віктарынах і прайшлі літаратурна-пазнавальны квэст.

На форуме ад Выдавецкага дома «Звязда» былі прадстаўлены кнігі розных жанраў і напрамкаў. Сярод іх можна знайсці як мастацкую літаратуру, так і пазнавальную. Галоўныя адметнасці выданняў — зразумелыя для маленькіх чытачоў гісторыі і прыгожыя ілюстрацыі, якія сэнсава дапаўняюць творы.

Кнігі «Пясочнае мора», «Цёплыя назвы Яе Вялікасці Вады», «Як Шубуршун мурашоў-чужынцаў выратаваў», напісаныя старшынёй Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесем Карлюкевічам, знаёмяць маленькага чытача не толькі з прыгажосцю мастацкага слова, але і даюць практычныя веды. Напрыклад, можна даведацца пра беларускія рэкі. А кніга пісьменніцы Іны Фраловай «Андрэйкава лета» адразу вярнула чытачоў у спякотныя месяцы. У зборніку апавяданняў аўтар праз цікавыя гісторыі тлумачыць дзецям, як гэта — быць сумленным і чаму прыемней аддаць апошні кавалачак любімага пачастунку дзядулі, чым з'есці яго самому. З роднай мовай і яе таямніцамі пазнаёміў зборнік вершаў, каламбураў, крылатых выразаў, смяшынак і небыліц Міхася Пазнякова «Канцэрт». Таксама сярод нядаўніх навінак Выдавецкага дома «Звязда» — вясёлы каляндар «Жыў на свеце дзядзька Тыдзень» **паэта Міколы ЧАРНЯЎСКАГА**:

— Я напісаў шмат кніг, больш за паўсотні. Гэтая кніга прысвечана расповеду пра ўсе дні тыдня і месяцы года. Таксама на фестывалі я прадставіў сваю кнігу «Абед па нотах», яна выдадзена ў перакладзе на рускую мову. Пішу вершы вясёлыя, з усмешкай, — кажа дзіцячы паэт.

**Старшыня Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Міхась ПАЗНЯКОЎ** адзначыў, што, акрамя сучасных класікаў дзіцячай літаратуры, мы таксама можам ганарыцца маладымі аўтарамі:

— На шчасце, у нас расце добрая змена таленавітых пісьменнікаў, якія працуюць у самых розных жанрах.

Сярод «звяздоўцаў» — і Кацярына Хадасевіч-Лісавая, якая праводзіць тэатралізаваныя прэзентацыі сваіх кніг, а дапамаюць у гэтым персанажы яе казак, увасобленыя ў ляльках. Пісьменніца стварыла шмат сусветаў: шахматнае ў «Сакрэтах аднаго каралеўства», касмічнае ў «Вухуціку і яго таямніцы» і містычнае ў «Гаспадыні ліловага цмока. Помста змрочнага птаха».

Падсумоўваючы вынікі фестывалю, **першы намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі, старшыня секцыі дзіцячай літаратуры СПБ Алена СТЭЛЬМАХ** адзначыла, што для пісьменніка выхаванне дзяцей праз літаратуру — першасная задача:

— Пісьменнікі засталіся вельмі задаволенымі той падтрымкай, якую нам аказалі пісьменнікі з розных куточкаў Беларусі. Аўтары з Гродна, Брэста, Полацка, Баранавіч прыехалі да нас не толькі з кнігамі, але і з выдатным настроем. Пісьменнікам у сваю чаргу было прыемна ўбачыць, што на сталічнай пляцоўцы ёсць удзячны чытач. Апошнім часам цікавасць да дзіцячай кнігі на беларускай мове ўзрастае — аб гэтым сведчыць не толькі попыт, але і эмоцыі саміх дзяцей, якія з радасцю знаёмяцца з нашымі аўтарамі. Саюз пісьменнікаў Беларусі плануе і далей займацца арганізацыяй падобных мерапрыемстваў — трэба яшчэ шырэй ісці да чытача. Зараз нам дасылаюць рукапісы маладыя дзіцячыя пісьменнікі, і мы спадзяёмся, што ў хуткім часе яны пабачаць свет у выглядзе кніг. Таксама плануюцца сустрэчы ў мінскіх бібліятэках з абласнымі пісьменнікамі. Мы вельмі хацелі б, каб такія фестывалі сталі добрай традыцыяй.

**Арына КАРПОВІЧ.**

# КАЛІ ЎЗРОСТ НЕ ПЕРАШКОДА

## МАЛАДЫЯ ДУШОЙ

— Развіццё валанцёрскага руху замацавана ў Нацыянальнай стратэгіі «Актыўнае даўгалецце — 2030» як адна з задач уцягвання пажылых грамадзян у жыццё грамадства, — адзначае **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення сацыяльнага абслугоўвання і сацыяльнай дапамогі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Мікалай АРОЛ**. — Ва ўсіх 146 тэрытарыяльных цэнтрах абслугоўвання насельніцтва створаны валанцёрскія атрады з ліку валанцёраў «сярэбранага» ўзросту.

Асноўная іх дзейнасць — аказанне даступнай дапамогі адзінокім людзям, якія апынуліся ў складаным жыццёвай сітуацыі. Прычым найперш гэта маральна-псіхалагічная падтрымка. А папросту кантактаванне, калі валанцёр цікавіцца, што адбываецца ў жыцці такога чалавека, як прайшоў яго дзень. І даступная сацыяльна-бытавая дапамога — у прыборцы, прыгатаванні ежы.

**Адзін з цікавых праектаў, якія тут рэалізоўваюцца, — «Казкі ад бабулі», калі валанцёры чытаюць дзецям. У такім жа фармаце ажыццяўляецца і дапамога сем'ям з дзецьмі, напрыклад, праект, дзе пажылыя жанчыны дзеляцца вопытам з маладымі — «Бабуля — маме».**

Яшчэ адзін важны напрамак — наведванне людзей, якія знаходзяцца ў дамах-інтэрнатах і сацыяльных установах. У Беларусі працуе 92 дамы-інтэрнаты розных напрамкаў і 62 аддзяленні кругласутачнага знаходжання. Тут спектр дзейнасці валанцёраў шырокі. Гэта выраб сувеніраў і арганізацыя дабрачынных акцый, канцэрты, віншаванне юбіляраў, гурткі па прынцыпе «роўны навучае роўнага». Дарэчы, апошні напрамак вельмі запатрабаваны: камп'ютарная і фінансавая адукаванасці, эканамічная бяспека, дзе пажылых людзей навучаюць, як не стаць ахвярай махляра. Папулярныя і экскурсіі «Мой родны горад», «Мой родны край», ветэранскія чытанні. А таксама заняткі, звязаныя са здаровым ладам жыцця: скандынаўская хадзьба, ёга, аздараўленчая гімнастыка.

Пад шэфствам валанцёраў знаходзяцца многія сацыяльна-педагагічныя цэнтры і прытулкі, створаныя пры іх. Адзін з цікавых праектаў, якія тут рэалізоўваюцца, — «Казкі ад бабулі», калі валанцёры чытаюць дзецям. У такім жа фармаце ажыццяўляецца і дапамога сем'ям з дзецьмі, напрыклад, праект, дзе пажылыя жанчыны дзеляцца вопытам з маладымі — «Бабуля — маме».

Цікавая для пажылых аказалася і праграма па навучанні бяспецы жыццядзейнасці. Тут расказваюць, з чым ісці ў лес і як сябе там паводзіць, калі заблудзіўся, што рабіць у выпадку навальніцы, у якім выглядзе павінна падтрымліваца печ і іншае. Прадстаўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях навучаюць спачатку валанцёраў, якія затым інфармуюць сваіх аднавяскоўцаў, сяброў, суседзяў і іншых.

Паводле даных Мікалая Арла, у валанцёрскіх атрадах, створаных пры ўстановах сацыяльнага абслугоўвання, здзейнічана каля 2,5 тысячы грамадзян пажылога ўзросту. Увогуле ж, установам сацыяльнага абслугоўвання дапамагае каля 7,5 тысячы прадстаўнікоў грамадскіх аб'яднанняў — ветэранская, Беларуская саюза жанчын, БРСМ, Чырвонага Крыжа, грамадскага аб'яднання інвалідаў, рэлігійных арганізацый. Пад патранажам валанцёрскіх атрадаў сёння знаходзіцца каля 20 тысяч грамадзян.

У лістападзе-снежні гэтага года ва ўсіх рэгіёнах пройдуць злёты валанцёраў «сярэбранага» ўзросту, прымеркаваныя да Дня валанцёра. Традыцыйна з 2017 года сумесна з Беларускай праваслаўнай царквой у нашай краіне праводзіцца конкурс «Святло міласэрнасці», дзе вызначаюцца найлепшы валанцёр тэрытарыяльнага цэнтра, найлепшы валанцёр дома-інтэрната для дзяцей-інвалідаў і інтэрната для дарослых. Узнагароджанні праводзяцца ў рамках Калядных чытанняў, арганізаваных БПЦ.

Фота з сайта redcross.by.

## БЯСПЛАТНА НАВУЧАЮЦЬ І СТРАХУЮЦЬ

— Важна, калі ў валанцёрскі рух уцягнута не толькі моладзь, але і людзі ўсіх узростаў. Некалькі гадоў таму мы праводзілі маркетынгавае даследаванне, каб вызначыць, наколькі беларусы гатовы ўдзельнічаць у валанцёрскім руху. Яно паказала, што рынак дабрачынасці вельмі шырокі, грамадскіх аб'яднанняў і арганізацый шмат, людзі гатовы стаць валанцёрамі. Але не ўсе грамадскія арганізацыі прапануюць зразумелыя і ясныя праекты, у якіх бы ахвотныя былі б гатовы ўдзельнічаць, — расказвае **намеснік генеральнага сакратара Беларускага Чырвонага Крыжа Раманія ЗОРЫНА**.

**Апошнія выклікі паказалі, што варта вярнуцца да размовы аб заканадаўчай аснове дзейнасці валанцёраў, у прыватнасці Закона аб валанцёрстве. Адзінага закона пакуль няма... Важнае не толькі азначэнне паняцця «валанцёр», але і тое, як на заканадаўчай аснове будзе матываваны і падтрыманы валанцёр, яго правы і абавязкі, хто можа лічыцца валанцёрам, а хто — не.**

У праектах гэтай арганізацыі задзейнічана каля 16 тысяч валацёраў. Многія з іх прыходзяць сюды, калі ўзнікаюць пэўныя сацыяльныя выклікі і патрабуецца дапамога. Апошнія з іх — пандэмія каранавіруснай інфекцыі і міграцыйны крызіс.

— Вялікая колькасць нашых валанцёраў, да 75 %, — маладыя людзі. Але ёсць і валанцёры «сярэбранага» ўзросту. З году ў год павялічваецца колькасць людзей працаздольнага ўзросту, якія днём ходзяць на працу ці вучобу, маюць сем'і, а ў вольны час удзельнічаюць у рабоце Чырвонага Крыжа, — удакладняе Раманія Зорына.

Чырвоны Крыж праводзіць навучанне сваіх валанцёраў. Гэта асновы першай дапамогі, псіхасацыяльнай падтрымкі, курсы па доглядзе дома з элементамі кінестэціх, па асаблівасцях работы з дзецьмі. Большая частка валанцёраў застрахавана.

**Дабрачыннасць і валанцёрства — не абавязак, а прывілегія. Каб з'явілася такое разуменне, пачынаць варта з ранняга дзяцінства.**

— Апошнія выклікі паказалі, што варта вярнуцца да размовы аб заканадаўчай аснове дзейнасці валанцёраў, у прыватнасці Закона аб валанцёрстве. Адзінага закона пакуль няма. У гэтым кірунку ідзе праца, у тым ліку з прыцягненнем грамадскіх арганізацый. Важнае не толькі азначэнне паняцця «валанцёр», але і тое, як на заканадаўчай аснове будзе матываваны і падтрыманы валанцёр, яго правы і абавязкі, хто можа лічыцца валанцёрам, а хто — не, — звярнула ўвагу прадстаўнік Чырвонага Крыжа.

## І НАВАТ ШКОЛЬНІКІ

Паводле меркавання спецыялістаў, валанцёрства варта пачынаць са школьнага ўзросту.

— Дабрачыннасць і валанцёрства — не абавязак, а прывілегія. Каб з'явілася такое разуменне, пачынаць варта з ранняга дзяцінства, — дадае **памочнік старшыні праўлення — прэс-сакратар Беларускага фонду міру Вікторыя ТРОЙНІЧ**. — Адна група праектаў нашай арганізацыі прадугледжана выключна для дзяцей і моладзі, другая — для ўсіх, але ў іх абавязкова ўдзельнічаюць дзеці і моладзь. Адзін з такіх рэспубліканскіх праектаў — «Сетка школ міру» ў Беларусі, цяпер іх у краіне 85. Ён рэалізоўваецца сумесна з Міністэрствам адукацыі і БПЦ. Яго мэта — выхаванне дзяцей і моладзі на прынцыпах сяброўства і ўзаемаразумення, талерантнасці, цярпімасці. Гэта праект не толькі карысны, але і перспектыўны, дазваляе прыцягнуць вялікую колькасць добраахвотных памочнікаў.

**Асноўная іх дзейнасць — аказанне даступнай дапамогі адзінокім людзям, якія апынуліся ў складаным жыццёвай сітуацыі.**

Валанцёры Беларускага фонду міру ўдзельнічалі ў стварэнні мемарыяла пад Полацкам «Урочышча Пяскі» на месцы захаранення загінулых у Вялікай Айчыннай вайне. Пры ўдзеле валанцёраў штогод аднаўляецца і ствараецца каля 60 помнікаў, яны займаюцца пошукавай работай, у прыватнасці збіраюць інфармацыю для школьных музеяў, перш за ўсё пра сваіх блізкіх.

Праект «Паклон вам нізкі, нашы дактары» аказваў дапамогу больш чым тром сотням установ аховы здароўя. Пяць гадоў спаўняецца акцыі «Дай пяць дабру» па дапамозе ўсім васьмі дамам дзіцяці ў краіне. Беларускі фонд міру пастаўляе ім і абслугоўвае апараты ШВЛ, якія выкарыстоўваюцца ў палеатыўнай медыцыне. Акцыя «Наш клопат ветэранам войн і працы» дазволіла абсталяваць больш за 1100 палат для ветэранаў па ўстановах аховы здароўя ўсёй краіны.

За ўвесь час у дзейнасці Беларускага фонду міру прыняло ўдзел больш за мільён чалавек. Яго работа цалкам будуецца на валанцёрстве і дабрачыннасці. Арганізацыя не фінансуецца дзяржавай і не атрымлівае грошы з-за мяжы.

**Алена КРАВЕЦ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**Віктар КАЖУРА:**

# «ГАНАРЫМСЯ КАШТОЎНЫМ ПРЫРОДНЫМ БАГАЦЦЕМ...»

**У апошнія дзесяць-пятнаццаць гадоў выдавецтва «Народная асвета», якое ў большай ступені сарыентавана на выпуск падручнікаў для агульнаадукацыйнай школы, падарыла юнаму чытачу і нямала сустрэч з кнігамі дзіцячых пісьменнікаў.**

Адна з навінак — нядаўна выдадзеная «Энцыклапедыя юнага натураліста». Настаўнік і таленавіты паэт з Вілейкі Віктар КАЖУРА склаў свой зборнік з трох тэматычных разделаў, дзе ў алфавітным парадку выклаў сваё паэтычнае бачанне аб раслінах, грыбах, звярах і птушках: «Ягады і кветкі — сонейкавы дзеткі»; «Бору-лесу будзь удзячны: пакланіся — ён аддзячыць»; «І на лузе, і ў бары ёсць свае гаспадары». Вершаваныя вобразы і сімвалы пісьменнік дапаўняе празаічным, эсэістычным аповедам пра выбраных ім «персанажаў». А сваю ідэю, характар кнігі «Энцыклапедыя юных натуралістаў» аўтар тлумачыць наступным чынам: «Дарагія юныя натуралісты! Кажуць, на карце свету Беларусь — маленькая. Можа, і так.

Але для нас яна — вялікая. Сваёй гісторыяй. Сваёй памяццю. Сваёй сучаснасцю. Сваёй будучыняй.

А яшчэ — багаццем. Азірніцеся!

На лузе — гербарый-разнатраўе, ад водару якога можа закружыцца галава.

Ягадныя россыпы, быццам вясёлка на зямлі, упрыгожваюць наваколле. Ды не толькі ўпрыгожваюць, а дораць чалавеку радасць і здароўе.

Грыбы летняй ці асенняй парою, схаваўшыся пад галінкі, лісце ды ігліцу, запрашаюць пагуляць з імі ў хованкі. Пры гэтым — вось хітруны! Нібы кажуць: «Пакланіся нам, чалавек, тады мы пакажамся». І ты кланяешся з удзячнасцю і радасцю, бо чым часцей кланяешся, тым паўнейшым становіцца твой кош.

У лясах і пушчах водзяцца зубры. Ды не толькі яны. У маладым сасонніку стаіліся паважныя ласі. А там з-за куста хітравата сочыць рыжы ліс, ці не пакажацца на паляне палахлівы заяц.

Рэкі і азёры віруюць ад незлічонай колькасці рыбы...»

Мудрасць, з якою Віктар Кажура ўзіраецца ў наваколле, перадаецца і чытачу. Кніга выключна прыгожа, шматзначна праілюстравана каляровымі здымкамі і малюнкамі раслін, звяроў, птушак... Асобна ў кароткіх паэтычна-празаічных аповедах вылучаны галоўныя парады, падказкі для зносін чалавека з той ці іншай раслінай, грыбам. «Энцыклапедыя юнага натураліста» выдадзена «Народнай асветай» накладам 1000 экзэмпляраў. Няма ніякіх сумненняў, што тыраж разыдзецца даволі хутка. Бацькам, настаўнікам — парада: спяшайцеся хутчэй набыць гэта сапраўды важкае ў справе экалагічнага, патрыятычнага выхавання выданне!

Кнігу вы зможаце знайсці ва ўсіх крамах ААТ «Белкніга» ў розных гарадах краіны. А таксама — у мінскай кнігарні «Акадэмкніга» па адрасе: Мінск, праспект Незалежнасці, 72.

**Кастусь ЛЕШНІЦА.**

Ваш выхад!

# ВОДАР ДУШЫ АЛЯКСАНДРЫ ГАЙДУК

## Брастаўчане пра яе гавораць: наша, народная...

**Прыгожая і таленавітая, жаноцкая і разумная, абаяльная і аптымістычная... Гэты спіс эпітэтаў у адрас Аляксандры Гайдук у яе родным горадзе Брэсце, куды яна нязменна, дзе б ні была, прыязджае на святы і спявае для гараджан, завяршаюць два важныя для эстраднай артысткі, тэлевядучай і прадзюсаркі словы: наша, народная... Для Аляксандры гэта высокае прызнанне.**

**Аляксандра Гайдук — эстрадная артыстка, тэлевядучая, прадзюсар... Асоба, якая адбылася, самадастатковая... Прафесія, загарадны дом, закаханы муж, двое дарослых сыноў, устойлівы пазітыўны імідж у грамадстве... Здавалася б, чаго яшчэ жадаць?! Жыві ды радуйся... Але ж Аляксандра і ў свае выдатныя сталыя гады, калі многае ў жыцці ўсведамляеш і адчуваеш сябе шчаслівай, застаецца нястомнай працаўніцай — не ўяўляе сябе без руху і ў прафесіі, і ў побыце, і ў духоўнай сферы.**

Па словах маёй суразмоўцы, Сусвет дорыць ёй многія магчымасці, таму і яна не можа бяздзейнічаць. Дарэчы, зусім нядаўна завяршыла вучобу ў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Беларусі. Гэтым летам прыхільнікі творчасці бачылі Аляксандру на сцэне «Славянскага базару ў Віцебску»: на закрыццё і ў Беларускім дні яна выходзіла да гледачоў з прэм'ерай песні «Самае галоўнае» разам з Валерыем Шматам. Ён заснавальнік і мастацкі кіраўнік гурта «Беларусы», кампазітар, арганіст, дырыжор. Як гаворыць Аляксандра, Валерый надзвычайны музыка і харызматычны саліст. Яму, дарэчы, нядаўна прысвоена званне заслужанага артыста Беларусі. Прыгожы ў іх атрымаўся дуэт.

Яшчэ Аляксандра Гайдук шчыльна занятая ў Маладзёжным тэатры эстрады, дзе ў цяперашні час працуе, а таксама ў іншых праектах. Ёй вельмі падабаюцца паездкі па беларускіх гарадах з фестывалем «Вытокі», адным з арганізатараў якога з'яўляецца Нацыянальны алімпійскі камітэт Беларусі. «Вытокі» — гэта ўжо беларускі брэнд, сімвал, які адлюстроўвае скіраванасць фестывальнага руху на папулярызацыю нацыянальнай культуры, спорту, гісторыі, традыцый і падтрымку малых гарадоў.

Мы гутарым з Сашай у адной з мінскіх кавярань. Вядзём няспешную, не кліпавую размову, як кажуць, за жыццё. І ўвесь час, гледзячы на маю візаві, так і хочацца ёй сказаць: якая ж вы немагчыма прыгожая! Проста вачэй не адарваць. Такая жаночая прыгажосць не можа заставацца па-за ўвагай не толькі дзякуючы знешняй, скажам так, форме: вочы, бровы, вусны, прычоска, фігура, вытанчаны парфюм... Саша Гайдук — перш за ўсё, па-мойму, гэта гранічная адкрытасць жыццю. Адсюль — зачаравальнае цяпло, якое яна выпраменьвае, глыбіня пачуццяў і той душэўны водар, які магічна прыцягвае да чалавека. А яшчэ мая суразмоўца і гаворыць выдатна. Зрэшты, мяркуйце самі: некаторыя моманты з нашай размовы перад вамі.

• Самае важнае ў жыцці — само жыццё і здароўе. Тваё і блізкіх. Таму я імкнуся шанаваць кожнае імгненне жыцця: быць тут і цяпер. Ніхто не ведае, што можа быць літаральна ў наступную хвіліну. Быць побач з тымі, хто табе пасапраўднаму дарагі і каму дарагі ты. Я ўмею ўжо ад чагосьці не самага важнага для мяне адмаўляцца. Казаць «не», чаго вельмі доўга рабіць не ўмела. Адчуваю: жыццё варта расходаваць на добрыя справы. Рада, што ў мяне цяпер ёсць такая магчымасць. Гэтым таксама займаюся.

• Здарылася тое дзякуючы Аляксандру Ціхановічу і Ядвізе Паплаўскай. Усё жыццё буду ўдзячная ім за дапамогу і падтрымку. Аляксандр і Ядвіга ў мяне паверылі, і я апынулася ў іх тэатры. Там і адбыўся мой першы сольны канцэрт, у 1999-м. Саша і Ядзя ўсялілі ў мяне ўпэўненасць, што я, 22-гадовая брастаўчанка, якая прыехала ў зусім чужы для мяне Мінск, змагу многага дасягнуць на эстрадзе. Дзе менавіта яны сталі для мяне хроснымі мамай і татам. Першы свой сольны альбом я запісала ў студыі «Ціхановіч-Паплаўская». Яны ж падштурхнулі мяне рабіць нешта карыснае для тых, хто мае ў тым патрэбу. А пасля тое зрабіў Сяргей Доўгаль, чалавек, які стаў для мяне сапраўдным сябрам. Ён жа навучыў мяне «ў сусветным маштабе» любіць не сябе... Здаецца, гэта называюць безумоўнай любоўю. Да таго ж Сяргей таксама падвёў мяне да думкі: як шмат мы можам зрабіць добрых спраў для тых, хто мае ў тым вялікую патрэбу. Ён у свой час заснаваў Дабрачынны фонд «Спирос» імя Аляксандра Ціхановіча. Гэты фонд дапамагае дзецям і дарослым інвалідам, якія жывуць у псіханеўралагічных інтэрнатах, а таксама людзям з абмежаванымі магчымасцямі. Вось і я пэўны час ездзіла туды з дабрачыннымі выступленнямі. А цяпер Сяргея не стала. Без слёз я сёння не магу сказаць пра яго: быў... Нястомна згадваю пра тое, з якім светлым чалавекам з вялікім сэрцам і чыстай душой я сябравала. З ім жа здзейсніла пробны палёт на лёгкаматорным самалёце. У верасні павінна была ехаць да Сяргея — а ён быў выдатным інструктарам-экзаменатарам, дырэктарам школы пілотаў «VRP Avia», дасведчаным лётчыкам з 38-гадовым стажам — каб самой вучыцца лятаць... Яшчэ думаю і пра тое, як яго на ўсё тое хапала. Калі Сяргей пра нешта прасіў, то заўсёды не для сябе. У мяне было адчуванне, што кожную хвіліну ён жыве для іншых. Мне здаецца, такая бескарыслівасць ёсць дар Божы. А калі так, то ўпэўненая: у сваю чаргу я павінна з вялікай стараннасцю дапамагаць тым, каму нашмат цяжэй, чым нам. Я гэта яму паабяцала... Бог, паўтаруся, мне пасылае вялікія магчымасці.

